

**Абследавацца ў суседняй краіне**

СТАР. 4



**Чаму «Белрыба» выстаўлена на продаж?**

СТАР. 5



**Эдвард Вайніловіч: першы беларускі бізнесмен**

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 мая 2014 г. АЎТОРАК № 82 (27692) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## РАЗАМ МОЖНА ЗРАБІЦЬ ВЕЛЬМІ ШМАТ

### Аляксандр Лукашэнка выступае за актыўны ўдзел царквы ў дзяржаўных справах

**Пра гэта Прэзідэнт Беларусі заявіў на сустрэчы з Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Паўлам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў беларускім грамадстве царква адыграла каласальную ролю. «Царква фактычна не адхілена ад дзяржаўных пытанняў. Вы ведаеце мой пункт гледжання. Я не лічу, што царква — па-за дзяржавай. Я, наадварот, хачу, каб царква актыўна прымала ўдзел у дзяржаўных справах. Вядома, са сваёй далікатнасцю, асцярогай. Мы нават вучымся ў царквы такім чынам працаваць», — сказаў Прэзідэнт.**



Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў Беларусі традыцыйна ўсталяваліся добрыя адносіны паміж дзяржавай і царквой. «Калі мы зможам дадаткова да таго, што ўжо спланавалі, дадаткова да той сістэмы, у якой мы працуем з нашай праваслаўнай царквой, чымсьці дапамагчы, мы з задавальненнем дапаможам», — запэўніў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што камуністычная ідэалогія, якая існавала ў савецкія гады, не заўсёды была эфектыўная, тым не менш яна існавала і задавала пэўны кірунак у мысленні людзей. «Пасля распаду Савецкага Саюза мы да гэтага часу спрабуем неяк выстраіцца ідэалагічна», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што ў гэтых умовах было натуральным звярнуцца да традыцыйных праваслаўных і хрысціянскіх каштоўнасцяў, тым больш што і ў камуністычнай ідэалогіі многае выкарыстоўвалася з таго, што прапаведавалі святары. «І мы не сталі ні адкідваць нічога, ні гвалтаваць людзей. Мы проста прапанавалі сваю дарогу ў храм і выкарыстоўвалі астатнія пастулаты нашай царквы. Мы проста разам дзейнічалі (дзяржава і царква. — Заўвага БЕЛТА ), ні пра што не дамаўляючыся, ішлі ў патрэбным кірунку», — распавёў беларускі лідар.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што царква і ў далейшым, знайшоўшы сваё месца ў грамадстве, будзе адыгрываць актыўную ролю.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што ён рэгулярна ўдзельнічае ў вырашэнні пытанняў, звязаных з царквой, і ў цэлым у яе ўзаемаадносінах з дзяржавай наладжана вельмі цеснае супрацоўніцтва. Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка адзначыў высокі ўзровень падтрымкі царквы ў беларускім грамадстве.

У сваю чаргу мітрапаліт Павел падзякаваў Прэзідэнту за разуменне і погляд на значэнне царквы для народа. «Я шчыра радуюся таму, што сёння тут, у гэтай квітнеючай краіне, стварыліся такія выдатныя ўзаемаадносіны паміж царквой і дзяржавай», — сказаў мітрапаліт Павел, адзначыўшы вялікую заслугу ў гэтым і свайго папярэдніка мітрапаліта Філарэта.

Паводле слоў уладыкі Паўла, сёння наладжана сумесная праца, «калі царква не ўмешваецца ў справы дзяржаўныя і дзяржава не ўмешваецца ў царкву. Але разам можна зрабіць вельмі шмат».

## ЗАХАВАЦЬ І РАЗВІВАЦЬ

### Прэзідэнт Беларусі лічыць недапушчальным разбураць СНД

**Пра гэта кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў на сустрэчы са старшынёй Выканкама — выканаўчым сакратаром СНД Сяргеем Лебедзевым, паведамляе БЕЛТА.**

«Скажам шчыра, мы перажываем няпросты перыяд», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Разам з тым ён выказаў упэўненасць, што з існуючымі праблемамі ўдасца справіцца. «Але разбураць, хай нават не зусім такую, якую б мы хацелі, Садружнасць, да якой мы імкнемся, тым не менш нельга», — падкрэсліў беларускі лідар.

«Таму мы з вамі прынялі рашэнне аб тым, што СНД была, ёсць і будзе, што мы павінны працаваць, і рашэнне аб тым, што, калі па пэўных прычынах Украіна не зможа старшынстваваць сёлета ў Садружнасці, мы возьмем на сябе гэтую адказнасць як дзяржава, дзе размешчана штаб-кватэра Садружнасці», — сказаў Прэзідэнт.

У сваю чаргу старшыня Выканаўчага камітэта СНД Сяргей Лебедзеў выказаў кіраўніку беларускай дзяржавы шчырую ўдзячнасць за гатоўнасць другі раз запар прыняць старшынства ў СНД і правесці на беларускай зямлі цэлы шэраг важных форумаў, якія першапачаткова планаваліся ва Украіне. «Вы вельмі хутка падхапілі сцяг СНД. Мне імпануюць вашы словы, што па-іншаму і быць не магло, паколькі штаб-кватэра СНД знаходзіцца ў Мінску. У мяне і ў дзяржавах Садружнасці ёсць глыбокая ўпэўненасць, што старшынства Беларусі другі год запар пройдзе дастаткова паспяхова», — заявіў старшыня Выканкама СНД.

У гутарцы з журналістамі па выніках сустрэчы Сяргей Лебедзеў падкрэсліў, што Беларусь традыцыйна выступала і выступае за захаванне і ўмацаванне інтэграцыйнага супрацоўніцтва ў СНД, што пацвердзіў і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Не засталася без увагі ў ходзе сустрэчы і сітуацыя ў суседняй Украіне. «Мы з трывогай і заклапочанасцю гаварылі аб развіцці падзей ва Украіне. Гэта наш гістарычны традыцыйны партнёр і сусед незалежна ад сяброўства ў СНД, звязаны з іншымі краінамі Садружнасці мільёнамі сувязяў», — сказаў старшыня Выканкама СНД, адзначыўшы, што «ўсе дзяржавы Садружнасці выступаюць за больш хуткую стабілізацыю абстаноўкі ва Украіне, за дасягненне міру і згоды ва ўкраінскім грамадстве. Гэта адпавядала б інтарэсам не толькі ўкраінскага народа, але і інтарэсам усіх краін СНД. Гэта асабліва падкрэсліў і Прэзідэнт Беларусі».

Што датычыцца старшынства Беларусі ў СНД, за гэты час на яе тэрыторыі будзе праведзена нямала розных форумаў і канферэнцый. Найбліжэйшае з буйных мерапрыемстваў — сустрэча кіраўнікоў урадаў Садружнасці 30 мая ў Мінску. У сярэдзіне кастрычніка ў беларускай сталіцы запланаваны саміт кіраўнікоў дзяржаў СНД.

## АЎТО БЕЗ НАРАКАННЯЎ

### Дзяржава будзе ствараць умовы, каб насельніцтва купляла айчынныя машыны

**Аляксандр Лукашэнка пратэсціраваў новыя легкавыя аўтамабілі Geely, выпрабленыя сумесным беларуска-кітайскім прадпрыемствам па выпуску легкавых аўтамабіляў СЗАТ «БелДжы», на вытворчых плошчах ААТ «Барысаўскі завод «Аўтагідраўзмацняльнік».**

Як паведаміла БЕЛТА, кіраўнік дзяржавы праехаў па горадзе на Geely SC7 (седан) і Geely LC Cross (кампактны хэтчбэк), а потым сеў за руль новага красовера Geely EX7, які выпрабаваў на спецыяльным палігоне, дзе максімальна адноўлены ўмовы бездарожжа. У цэлым Прэзідэнт застаўся задаволеным тэхнічнымі характарыстыкамі машын. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што лічыць Geely SC7 машынай, якая цалкам падыходзіць для вадзіцеляў-пачаткоўцаў, і вельмі добра адазваўся аб дзвюх пратэсціраваных марках аўтамабіляў. Як запэўнівалі кіраўніка дзяржавы вытворцы, за час продажаў аўтамабіляў сур'ёзных нараканняў ад пакупнікоў не паступала, паўторных дэфектаў не выяўлена.

Па выніках тэст-драйва Прэзідэнт даў даручэнне ўраду прадумаць сістэму стымулявання продажаў аўтамабіляў Geely на ўнутраным рынку. «Стымуляваць продаж аўтамабіляў мы будзем разам. І дапамагаць, падштурхоўваць насельніцтва, каб яно купляла», — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы, што падтрымка можа быць аказана ў выглядзе крэдытаў на доўгі час. «Мы падумаем ва ўрадзе, як падтрымаць беларуса, які купляе тут аўтамабіль. Пакуль — беларуса. Падумаем і аб іншых. Таму што якая розніца, хто будзе купляць аўтамабілі?» — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2



## БЕЛЫЯ ПТУШКІ ЗВЫЧАЙНАГА ШЧАСЦЯ

**Гэты дом на адной з вуліц аграгарадка Навасёлкі Петрыкаўскага раёна прываблівае сваёй дагледжанасцю, пафарбаванымі ліштвамі і... птушкамі. Ужо болей за паўстагоддзе парачка галубкоў красуецца над кожным з вокнаў гасціннага дома Пятра і Клаўдзіі Дубінаў, сімвалізуючы любоў, згоду, шчасце і дабрабыт. Менавіта столькі крочаць па жыцці разам Пётр Піліпавіч і Клаўдзія Аляксандраўна, уласнымі рукамі збудаваўшы свой дом.**

**— Галубы спадарожнічаюць нам па жыцці з 1960 года, калі мясцовы майстар-цясляр Васіль Ракіцкі рабіў усю сталярку, і вокны таксама, — удакладняе гаспадар. — Я дапамагаў яму — пілкай выразаў узоры ліштваў, хацеў, каб дом быў яшчэ і прыгожым.**

**У гэтым доме выраслі трое дзяцей, прыязджаюць ужо дарослыя ўнукі. Адпрацаваўшы па шмат гадоў, дачакаліся пенсіі гаспадары. Белыя птушкі на ліштвах — сведкі хоць і нялёгкага, але годнага і вартага павагі жыцця гэтых простых людзей.**

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ДУБКОЎ, намеснік старшыні праўлення Нацбанка:**

***«Забарона на выдачу крэдытаў без даведак аб даходах скароціць колькасць спантанных пакупак у крамах, бо грамадзяне будуць больш абдумана падыходзіць да пытання аб атрыманні так званых «дробных» крэдытаў. Мы выбудавалі сістэму аналітыкі, таму мяркуем, што спантанныя пакупкі, якія ажыццяўляюцца насельніцтвам, прычым па аблегчанай сістэме крэдытавання, правакуюць прыняцце неадэкватных рашэнняў. І прапанавалі пэўную рэгламентацыю, каб купля тых ці іншых тавараў адбывалася разумна. На самой справе банку патрэбны кліенты, якія ўпэўнены ў сваіх даходах, умеюць правільна планаваць сваю фінансавую будучыню, сваю фінансавую нагрузку. Якраз для банка гэтая мера станоўчая».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 06.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9990,00 | ▲ |
| Еўра | 13860,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 279,00 | ■ |
| Укр. грыўня | 861,21 | ▲ |

■ Надвор'е

## ЗАМАРАЗКІ І НАВАТ МОКРЫ СНЕГ

### Сур'ёзна пацяплее толькі з чацвярга

**У аўторак на тэрыторыю нашай краіны працягне паступаць халоднае паветра з поўначы Еўропы, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.**

Таму сёння па паўночным усходзе пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж, магчымы мокры снег). Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 7 градусаў па паўночным усходзе да 14 цяпла па паўднёвым захадзе Беларусі. А вось 7 мая атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе да нас кароткачасовыя дажджы ўначы па захадзе краіны, а ўдзень — ужо паўсюдна. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе плюс 1-6 цяпла, а па ўсходзе прагназуюцца замаразкі да 0 — мінус 5 градусаў. Удзень тэмпературны фон складзе плюс 10-17 градусаў, а па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — да 18-20 цяпла.

Цяплець пачне толькі ў чацвер. Аднак месцамі чакаюцца невялікія дажджы і нават навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе плюс 6-12 градусаў, удзень — 14-20, а па паўднёвым усходзе прыгрэе да 22 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У РАДЗЕ ЗАРЭГІСТРАВАНЫ ЗАКОНАПРАЕКТ АБ ПРАВЯДЗЕННІ АПЫТАННЯ АБ ДЭЦЭНТРАЛІЗАЦЫІ ЎЛАДЫ



У Вярхоўнай Радзе Украіны зарэгістраваны законапраект аб правядзенні ўсеўкраінскага кансультатыўнага апытання 25 мая па пытаннях, звязаных з дэцэнтралізацыяй улады. Як паведамляецца на сайце парламента, ён унесены прызначаным Вярхоўнай Радай прэм'ер-міністрам Арсеніем Яцанюком. Раней Яцанюк казаў пра неабходнасць разгляду закона аб агульнанацыянальным апытанні ў парламенце. «Агульнанацыянальнае апытанне будзе праходзіць па тых пытаннях, якія сёння хвалююць Украіну, — пытанні адзінства, тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы і пытанні дэцэнтралізацыі ўлады», — адзначыў палітык.



### НА ПАДВОДНЫХ ЛОДКАХ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ І ФРАНЦЫІ БУДУЦЬ СЛУЖЫЦЬ ЖАНЧЫНЫ

На падводных лодках Каралеўскага ваенна-марскога флоту Вялікабрытаніі пачалі служыць жанчыны. Першымі брытанкамі, якія атрымалі допуск да падобнай службы, сталі тры жанчыны-лейтэнанты. Да службы на субмарынах дзяўчат рыхтавалі па спецыяльным курсе для падводнікаў. Раней жанчынам не дазвалялі служыць на падлодках з-за магчымых рызык для здароўя. Эксперты сцвярджалі, што павышанае ўтрыманне вуглякіслага газу аказвае на жаночы арганізм больш негатыўны ўплыў, чым на здароўе мужчын-падводнікаў. Аднак незалежнае даследаванне Інстытута марской медыцыны паказала, што такая служба супрацьпаказана толькі цяжарным жанчынам. Таксама стала вядома, што ўрад Вялікабрытаніі пачынае падрыхтоўку і іншых жанчын-падводнікаў. У 2015 годзе жанчыны пачнуць праходзіць службу на атамных падводных лодках, у тым ліку і найноўшых. Між тым камандаванне Ваенна-марскіх сіл Францыі таксама вырашыла ўпершыню дапусціць прадстаўніц слабага полу да нясення службы на атамных субмарынах з балістычнымі ракетамі. Эксперымент пачнецца ў 2015 годзе.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ГУЛЬНІ НА ПЛАНШЭТАХ І СМАРТФОНАХ ШКОДНЫЯ ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ ДЗЯЦЕЙ

**Даследаванне 65 сем'яў, што праводзілася Дзіцячым медыцынскім цэнтрам Коэна, выявіла сувязь паміж гульнямі і слаба развітай мовай, піша The Telegraph.**

Атрымліваецца, гульні не развіваюць дзяцей, хоць бацькі так і не лічаць. Паводле статыстыкі, дзеці пачынаюць карыстацца сэнсарнымі прыладамі ў 11 месяцаў. І час выкарыстання складае прыкладна 30 хвілін у дзень. Розніцы ў развіцці ў дзяцей, якія гулялі ў «развіваючыя» і ў звычайныя гульні, няма, сцвярджаюць навукоўцы.



Аднак дзеці, якія гулялі ў звычайныя гульні накшталт Angry Birds або Fruit Ninja, усё-такі горш спраўляліся з тэстамі на маўленчыя навыкі, якія датычылі і разумення прамовы, і самога навыку гаворкі.

Эксперты заяўляюць, што тэхнічныя навінкі не могуць замяніць увагі бацькоў.

КОРАТКА

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне «Аб зацвярджэнні рашэння савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі і аб выдзяленні сродкаў на фінансаванне расходаў гэтага фонду ў 2014 годзе».

Пагадненне паміж урадамі Беларусі і Турцыі аб узаемнай адмене віз уступіць у сілу з 1 чэрвеня гэтага года. Гэта азначае, што беларускія грамадзяне змогуць знаходзіцца на тэрыторыі Турцыі на працягу 30 дзён з даты ўезду, не афармляючы візы. На працягу аднаго года можна будзе ўязджаць у Турцыю без візы шматразова, але агульны тэрмін такога знаходжання не павінен перавышаць 90 дзён.

Чэмпіянат свету-2014 па хакеі ў Мінску пройдзе без тытунёвага дыму. Курэнне будзе забаронена не толькі ў «Мінск-Арэне» і «Чыжоўка-Арэне», але і ў прылеглых да іх фан-зонах.

■ Ведай нашых

## «ЗАЛАТОЕ ПЯРО» — ЗА ПРАЕКТ «СУСТРЭЧА БЕЗ АБЦАСАЎ»

**У Дзень друку ўзнагародзілі пераможцаў і лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу «Залатое пяро», які традыцыйна праводзіць Беларускі саюз журналістаў. Пераможцам у намінацыі «Лепшая работа ў інфармацыйных і аналітычных жанрах» стала наша калега, аўтарка творчага праекта «Сустрэча без абцасаў», рэдактар аддзела газеты «Звязда» Надзея Дрыла.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Паводле слоў **старшыні Беларускага саюза журналістаў Анатоля Лемяшонка,** «Залатое пяро» — гэта самы прэстыжны конкурс у беларускай журналістыцы, бо ў склад журы ўваходзяць сапраўдныя аксакалы пяра.

— Конкурс жыва рэагуе на выклікі часу, — адзначыў Анатоль Лемяшонак. — Напрыклад, сёлета мы ўвялі дзве новыя намінацыі. Падумалі, што не хапае добрых газетных нарысаў. Так з'явілася намінацыя «Лепшы нарыс», пераможцам у якой стаў Леанід Екель, аглядальнік газеты «СБ. Беларусь сегодня». Таксама ўвялі намінацыю «Прэмія за грамадзянскую пазіцыю журналіста», бо ў любой публікацыі вельмі важнай з'яўляецца грамадзянская пазіцыя самога аўтара. Пераможцам у гэтай намінацыі стаў старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька.

Усяго на конкурс было пададзена больш за 40 творчых работ, як з рэспубліканскіх, так і з рэгіянальных СМІ. Прычым, як адзначыў **першы намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў Вадзім Гігін,** насамрэч гэтая лічба значна большая, бо, перш чым трапіць на суд журы, творчыя папкі прайшлі строгі папярэдні адбор пярвічнымі журналісцкімі арганізацыямі.

— Хацелася б адзначыць, што ў нас вельмі актыўная і талковая моладзь, — падкрэсліў Анатоль Лемяшонак. — Нягледзячы на тое, што мы два гады таму ўвялі асобны конкурс для маладых журналістаў «Дэбют», яны ўмудраюцца перамагаць і ў гэтым конкурсе («Залатое пяро». — **Аўт.**), дзе раней, як правіла, прымалі ўдзел толькі вопытныя, мацёрыя акулы пяра.

**Уладзімір ДРУК**

# АЎТО БЕЗ НАРАКАННЯЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што сам вытворца аўтамабіляў павінен прыкласці намаганні, каб забяспечыць высокую якасць аўтамабіля па прымальнай цане.

Гутарачы з працоўным калектывам прадпрыемства «БелДжы», Аляксандр Лукашэнка закрануў і тэму міжнароднага супрацоўніцтва. Паводле яго слоў, Беларусь не можа сабе на шкоду ўвайсці ў Еўразійскі эканамічны саюз на няроўных умовах.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што калі Беларусь, Расія і Казахстан дамаўляюцца аб стварэнні саюза, «значыць, перашкод ужо быць не павінна і ўсім трэба працаваць на роўных умовах». «Так я паставіў пытанне перад сваімі калегамі-прэзідэнтамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка аб нядаўняй сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў «тройкі» ў Мінску на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета. «У апошнія дні ў Мінску ішла вельмі не тое што строгая — жорсткая размова наконт будучыні нашых легкавых аўтамабіляў. Зразумела, нашых партнёраў насцярожвае тое, што вы (СЗАТ «БелДжы») даволі паспяхова стартанулі, асабліва ў гэтым годзе, у першым квартале, — канстатаваў Прэзідэнт. — Вы ўжо на новым прадпрыемстве выйшлі на 10 працэнтаў рэнтабельнасці. Гэта нядрэнна. Летась было крыху больш як адзін працэнт, цяпер — у дзесяць разоў больш». Такіх паказчыкаў удалося дасягнуць, нягледзячы на тое, што назіраўся спад вытворчасці аўтамабіляў на расійскім рынку. «Але Geely дае рост — амаль 50 працэнтаў на расійскім рынку. Гэта, вядома, насцярожвае і расіян. Напэўна, думаюць аб тым, што кітайцы заб'юць расійскі аўтапрам з тэрыторыі Беларусі», — сказаў Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы лічыць неабходным да стварэння ЕАЭС вырашыць з краінамі-партнёрамі ўсе праблемныя пытанні. На думку кіраўніка дзяржавы, цалкам зразумела, што кожная краіна спрабуе абараняць свой рынак, але калі ствараць саюз, то трэба першапачаткова дамовіцца аб раўнапраўных умовах работы.

Пад канец сваёй сустрэчы з працоўным калектывам прадпрыемства Прэзідэнт пажадаў: «Дай Бог, каб мы ціха, спакойна жылі сваім нармальным жыццём і ніколі не выходзілі на вуліцы і плошчы з дубінамі, кактэйлямі Молатава. Ужо сёння і з ружжамі, і з кулямётамі выходзяць, самалёты збіваюць, самі ў сваіх страляюць». Ён падкрэсліў, што да гэтага нельга дайсці. «Вось гэта самае галоўнае. Я проста хачу, каб мы спакойна працавалі. Няхай мы будзем 500-600 долараў атрымліваць, але будзем стабільна працаваць у цэхах», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Вечарам у Барысаве адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця самага сучаснага футбольнага стадыёна ў краіне. Удзел у цырымоніі адкрыцця «Барысаў-Арэны» прыняў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу на тое, што стадыён не ўступае аналагічным збудаванням за мяжой і з'яўляецца цудоўным падарункам балельшчыкам, жыхарам Барысава і ў цэлым Міншчыны.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што беларускім футбольным камандам неабходна значна павысіць прафесійны ўзровень. «Спорт — футбол, хакей, іншыя віды — гэта ўжо не гульня, спаборніцтвы, барацьба, гэта вайна, і ты павінен змагацца за перамогу. Калі гэты настрой на перамогу будзе, мы абавязкова ўбачым тут «зорак» сусветнага футбола і іх пераможам», — сказаў Прэзідэнт.



Фота Надзеі БУЖАН.

■ Меркаванне

# МЯСЦОВЫЯ НАВІНЫ БУДУЦЬ ЗАПАТРАБАВАНЫЯ ЗАЎСЁДЫ

**Галіна ЛАЗОЎСКАЯ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, не адзін год адпрацавала ў журналістыцы: была рэдактарам аддзела радыё «Маладзечанскай газеты». Дэпутат выказала ўпэўненасць, што газетам не пагражае знікненне — яны проста паступова зменяцца пад уплывам патрабаванняў часу — стануць больш аналітычнымі, у той час як іх інтэрнэт-версіі возьмуць на сябе асноўную інфармацыйную нагрузку.**

— Хачу звярнуцца да гістарычных аналогій. Са з'яўленнем радыё друкаваным выданням прадказвалі непазбежную пагібель. Але газеты засталіся. Выжылі яны і пасля росквіту тэлебачання. Сумняваюся, што той жа інтэрнэт вынесе адназначны вердыкт, маўляў, газеты аджылі сваё. Так, канкурэнцыя абавязкова будзе, яна нават узмоцніцца, бо вырасла цэлае пакаленне «дзяцей віртуальнай прасторы». Але чалавек не зможа ўвесь час заставацца сам-насам з «жалезам» — яму абавязкова трэба будзе звяртацца да друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, каб грунтоўна паглыбіцца ў тую ці іншую праблему, пачытаць пра тое, што сапраўды цікава.

Галіна Лазоўская ўпэўнена, што раённыя газеты не знікнуць.

— Найперш кажу пра мясцовую перыёдыку — больш блізкую да чалавека. Ён будзе звяртацца да друкаванай версіі, каб прачытаць пра свой горад, сваю вёску, пра свайго калегу альбо суседа. Дарэчы, у Еўропе рэгіянальныя газеты паступова ператвараюцца ў сямейныя выданні, якія пішуць пра жыццё простых людзей, пра іх клопаты, захапленні...

Дарэчы, «Маладзечанская газета» ўжо не першы год працуе за кошт уласна заробленых сродкаў, атрыманых з даходаў ад рэкламы і накладу.

**У Еўропе рэгіянальныя газеты паступова ператвараюцца ў сямейныя выданні, якія пішуць пра жыццё звычайных людзей, пра іх клопаты, захапленні...**

— Апошнім часам многія раённыя газеты палепшылі сваю эканоміку, перасталі карыстацца датацыямі з бюджэту. Мяняецца да лепшага фінансавая сітуацыя і ў буйных рэспубліканскіх выданнях. Разам з тым дзяржава мае права падстаўляць плячо таму, хто пакуль аб'ектыўна не ў стане самастойна выжываць. Як-ніяк, але сродкі масавай інфармацыі былі і будуць чацвёртай уладай. Тут напрошваецца аналогія пра армію: хто не ў стане карміць свае войска, той будзе карміць чужое.

Дэпутат упэўнена, што раённыя газеты і сёння запатрабаваны ў чытача, асабліва ў прадстаўнікоў сярэдняга і старэйшага пакалення. Яны не толькі даносяць да гараджан і вяскоўцаў разнастайную інфармацыю, але і канкрэтную дапамогу аказваюць, якая тычыцца найперш вырашэння шматлікіх сацыяльна-бытавых праблем.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■ Прафесійны Алімп

# У БРАЗІЛІЮ, НА АЛІМПІЯДУ

**Беларусь стала 68-й краінай, якая далучылася да WorldSkills International (WSI).**

Мэтай гэтай унікальнай некамерцыйнай міжнароднай арганізацыі з'яўляецца папулярызацыя працоўных прафесій, у тым ліку праз правядзенне міжнародных спаборніцтваў, якія яшчэ называюць алімпіядай у прафесійным майстэрстве.

Арганізацыя ахоплівае 68% насельніцтва планеты і ўсе кантыненты, за выключэннем хіба што Антарктыды. Кожныя два гады WorldSkills праводзіць конкурс прафесійнага майстэрства ў шасці галінах: транспарт і лагістыка, будаўніцтва і тэхналогія будаўнічай вытворчасці, тэхналогія вытворчасці і тэхналогія машынабудавання, інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, творчыя прафесіі і сацыяльна-бытавое абслугоўванне.

Апошнія спаборніцтвы прайшлі ў Лейпцыгу, сабралі 200 тысяч гледачоў і расцягнуліся ажно на чатыры дні. Пра гэта расказаў на сустрэчы з журналістамі **прэзідэнт WSI Сайман БАРТЛІ.** Але спаборніцтвы, па словах кіраўніка WSI, праводзяцца не дзеля саміх спаборніцтваў. Іх фармат выкарыстоўваецца для таго, каб дапамагчы прадстаўнікам самых розных краін павысіць прафесійныя кампетэнцыі і спрыяць распаўсюджванню ў свеце міжнародных прафесійных стандартаў.

Ёсць краіны, якія стабільна перамагаюць у міжнародных спаборніцтвах: так, на апошніх шасці чэмпіянатах лідзіравалі прадстаўнікі Карэі. Ці варта здзіўляцца такому факту, улічваючы, што менавіта гэтая краіна з'яўляецца самым паспяховым вытворцам у свеце? Ці ўсё наадварот: Карэя з'яўляецца самым паспяховым вытворцам у свеце дзякуючы менавіта высокай кваліфікацыі работнікаў, занятых у вытворчасці?

У ТОП-15 краін у Еўропе ўваходзяць Аўстрыя, Швейцарыя, Германія, Францыя, Вялікабрытанія, Фінляндыя. У азіяцкім рэгіёне лідзіруюць Японія і Кітай. Традыцыйна вельмі моцна выступаюць на спаборніцтвах прадстаўнікі Аўстраліі, а на амерыканскім кантыненце цуды прафесійнага майстэрства дэманструюць у апошнія 15 гадоў прадстаўнікі Бразіліі. Як зазначыў Сайман Бартлі, Бразілія выйшла са статусу «ніхто і нішто» ў плане авалодання прафесійнымі кампетэнцыямі, і гэта яскрава відаць па тэмпах развіцця эканомікі гэтай краіны. Наступныя «алімпійскія гульні» сярод прадстаўнікоў рабочых прафесій пройдуць у 2015 годзе ў Сан-Паўла ў Бразіліі. І ўдзел у іх упершыню возьмуць і беларусы. Прэзідэнт WSI кажа, што не можа прыгадаць выпадку, каб краіна, якая толькі што далучылася да спаборніцтваў, адразу здзейсніла магутны рывок і трапіла ў «топ» пераможцаў.

Але **дырэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Аркадзь ШКЛЯР** настроены вельмі аптымістычна:

— Нам кажуць, што мы не можам адразу вылавіць вялікую рыбу, але мы паспрабуем гэта зрабіць. Ёсць намінацыі, дзе нам гэта пад сілу.

А 20-22 мая ў Футбольным манежы ў сталіцы пройдзе Першы нацыянальны чэмпіянат прафесійнага майстэрства сярод рабочых, служачых, спецыялістаў і навучэнцаў. Фактычна гэта будзе свята прафесійнай адукацыі, у рамках якога запланаваныя і «Млын моды», і майстар-класы па цырульніцкім майстэрстве, і многія іншыя мерапрыемствы.

— Не знайшлося ніводнай кампаніі, ніводнага прадпрыемства, куды б мы звярнуліся і нам бы там адмовілі ў падтрымцы: сваё самае сучаснае абсталяванне для спаборніцтваў прадаставяць «Фольксваген», «Бош», «Інтэграл», «Атлант» і іншыя. Мы замахнуліся адразу на 20 кампетэнцый. Удзел у чэмпіянаце возьмуць амаль дзве сотні прадстаўнікоў прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, — дадаў Аркадзь Шкляр.

Застаецца дадаць, што стаўленне да сістэмы прафесійнай адукацыі змяняецца ва ўсім свеце глабальна, таму што яе ўклад у сучасную эканоміку развітых краін цяжка пераацаніць.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

1944-2014 70 гадоў вызвалення

# ПАРТЫЗАНСКІ ФРОНТ

## Такога руху супраціўлення, як у Беларусі, не было больш нідзе

**Можна доўга падлічваць, колькі эшалонаў за час ваеннага ліхалецця пусцілі партызаны пад адхон, колькі акупантаў і іх прыслужнікаў знішчылі за гады Вялікай Айчыннай вайны, але нават праз сем мінулых ад ліхалецця дзесяцігоддзяў размах руху народнага супраціўлення ўражвае. 374 тысячы партызанаў і 70 тысяч падпольшчыкаў змагаліся ў тыле ворага на акупаванай беларускай зямлі. Гісторыкі кажуць: усе гады вайны на Беларусі фактычна дзейнічаў партызанскі фронт...**

— Што адметна, савецкая ваенная дактрына ў канцы 1930-х гадоў не дапускала магчымасці выкарыстання партызанскага руху падчас баявых дзеянняў, — гаворыць доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі Аляксей Літвін. — Тады меркавалася, што ў выпадку нападу праціўнік будзе тут жа спынены ўсімі сіламі, і пасля баі пяройдуць ужо на тэрыторыю ворага. Менавіта таму лічылася, што неабходнасці рыхтаваць людзей да дзеянняў ва ўмовах магчымай акупацыі няма. Хоць трэба заўважыць, што ў 20-я гады і нават у пачатку 30-х такая магчымасць дапускалася. Сярод партыйнага складу, супрацоўнікаў НКУС, ваенных нават праводзіліся спецыялізаваныя заняткі. Аднак усе яны былі згорнуты ў 1935 годзе, калі быў прыняты новы статут, у якім і была акрэслена тагачасная савецкая дактрына. І калі б тады хтосьці сказаў, што давядзецца ствараць партызанскія атрады, яго тут жа залічылі б у панікёры з усімі наступствамі.

Аднак ранейшыя ўяўленні пераламаў імклівы наступ немцаў у самым пачатку вайны. 29 чэрвеня 1941 года, калі акупанты ўжо занялі Мінск, была прынята Дырэктыва Саўнаркама СССР і ЦК ВКП(б), у якой і былі сфармуляваны асноўныя задачы партызанскага руху. Менавіта ад гэтага моманту партызаны пачалі дзейнічаць узаконена.

— Але ў раёнах, якія былі ўжо пад немцамі, партызанскія фарміраванні ствараліся стыхійна, — зазначае Аляксей Літвін. — Афіцэры і партыйныя работнікі, якія трапілі ў акружэнне, але ворагу ў палон не здаліся, уступілі ў барацьбу аўтаномна. Як правіла, яны выкарыстоўвалі старыя напрацоўкі, у прыватнасці, вопыт, атрыманы падчас грамадзянскай вайны...

Увогуле можна сказаць, што падчас усёй вайны нашы народныя мсціўцы былі ў цэнтры ўвагі. Адзінай з усіх акупаваных тэрыторый Саюза, дзе ў 1942 годзе адзначаўся найбольшы росквіт партызанскага руху, была менавіта Беларусь. Так, рост адзначаўся і ва Украіне, і ў Расіі, аднак адбывалася гэта за кошт рэгіёнаў, з якіх адступала Чырвоная Армія. А ў нас акупаванай была ўся рэспубліка. Імклівае распаўсюджванне партызанскага руху прывяло да стварэння вольных ад акупантаў зон, дзе была аднаўлена савецкая ўлада.

Да канца 1943 года буйных партызанскіх зон у Беларусі налічвалася 20. А на стыку Беларусі з іншымі саюзнымі рэспублікамі былі створаны партызанскія краі. Толькі ў адным з іх, які знаходзіўся ў раёне лініі Лоеў — Мазыр — Петрыкаў — Столін — Ракітна, пад абаронай народных змагароў было каля 200 тысяч чалавек! 10 тысяч квадратных кіламетраў займаў другі партызанскі край на стыку Беларусі, Расіі ды Латвіі, дзе разам дзейнічалі партызаны з усіх трох рэспублік. Натуральна, што масавае супраціўленне прыйшлося не даспадобы немцам.

— Акупанты сталі ствараць адмысловыя фарміраванні для барацьбы з партызанамі. Калі ў студзені 1944 года ў іх склад уваходзілі 30 тысяч карнікаў, то ў маі іх колькасць дагналі да 100 тысяч, — працягвае Аляксей Літвін. — Самая ж буйная карная аперацыя пад назвай «Свята вясны» адбывалася з 11 красавіка па 5 мая 1944 года супраць партызанаў Полацка-Лепельскай зоны. У баявых дзеяннях супраць партызан удзельнічала 60 тысяч салдат і афіцэраў, 137 танкаў, 235 артылерыйскіх гармат, 70 самалётаў, 2 браняпоезды. На чале аперацыі стаялі групенфюрэр войскаў СС, генеральны камісар Беларусі фон Готберг і камандуючы 3-й танкавай арміі генерал-палкоўнік Рэйнгардт. А хто ёй супрацьстаяў? 16 партызанскіх брыгад агульнай колькасцю ў 17,5 тысячы чалавек... Але немцам сваёй мэты дасягнуць так і не ўдалося.

Сёння беларускія і расійскія гісторыкі падрыхтавалі сумесную манаграфію аб вызваленні Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яе асновай сталі дакументы як Стаўкі вярхоўнага камандавання, так і франтавыя архівы. Фотакопіі многіх дакументаў з'явяцца ў адкрытым друку ўпершыню.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Меркаванне



# ТРАГЕДЫЯ ЗА ТРАГЕДЫЯЙ

## Найноўшая гісторыя Украіны фарміруецца на аснове новых памылак?

**Падзеі 2 мая ў Адэсе, калі падчас масавых сутыкненняў і пры штучна арганізаваным пажары ў Доме прафсаюзаў загінулі 46 чалавек, а ў бальніцы трапіла больш за дзве сотні пацярпелых, сталі чарговай трагедыяй, супастаўнай па велізарнай колькасці ахвяр з кіеўскай бойняй, якая адбылася 19-20 лютага. Пры гэтым шанцы знайсці і прыцягнуць да суду сапраўдных вінаватых у абодвух здарэннях са страшным зыходам імкнуцца да нуля, паколькі ўладныя і сілавыя інстытуты ў краіне альбо паралізаваныя, альбо працуюць па неспасціжных для замежнікаў схемах. Дададзім да гэтага дзясяткі ахвяр з моманту пачатку «антытэрарыстычнай аперацыі» на паўднёвым усходзе Украіны. Падобна на тое, што найноўшая гісторыя Украіны фарміруецца на аснове ўсё новых і новых памылак, якія прыводзяць кожны раз да вялікай колькасці загінулых і параненых.**

Беларусь не раз заяўляла, што ў яе інтарэсах адзіная і непадзельная Украіна. Але як гэтага дамагчыся? У заходняй і цэнтральнай частках Украіны дамінуе адзін пункт гледжання аб будучыні развіцця краіны, на паўднёвым усходзе — кардынальна іншы. Відавочна, што для захавання дзяржавы неабходна адчайна і настойліва шукаць агульныя падыходы, збліжаць пазіцыі, ісці на кампрамісы. Замест гэтага мы з'яўляемся сведкамі эскалацыі напружання, узаемных пагроз і абвінавачванняў, якія правакуюць такія масавыя і жорсткія расправы, як у Адэсе.

Чаму пагрозы, абвінавачванні ў сепаратызме і рэйды на баявых машынах пяхоты па гарадах паўднёвага ўсходу бесперспектыўныя для захавання тэрытарыяльнай цэласнасці ўкраінскай дзяржавы і толькі пагаршаюць сітуацыю?

Па-першае, перамовы, а не запалохванне, будуць плённыя, паколькі на паўднёвым усходзе Украіны пражывае больш за трэць насельніцтва краіны. У васьмі абласцях, якія складаюць рэгіён, пражывае амаль 19 млн чалавек. Вядома, не ўсе з іх падзяляюць пратэстныя настроі супраць новага кіеўскага ўрада, але лік незадаволеных рэзка павялічыцца пасля аблог гарадоў вайсковымі падраздзяленнямі, стралянінам на вуліцах і жахлівых карцін забітых і параненых, многія з якіх з'яўляюцца сябрамі або суседзямі. Такімі спосабамі папулярнасць ураду не заваяваць, і новых прыхільнікаў на паўднёвым усходзе не знайсці. Пастаянна захопліваць і кантраляваць пасля гэтага кожны захоплены горад Кіеў не можа, паколькі армія знаходзіцца ў вартым жалю стане, як і дзяржаўная казна.

А тое, што ў гэтай сітуацыі да ўдзелу ў вайсковых аперацыях прыцягваюць аматараў пастраляць з Заходняй Украіны, якія негатыўна ўспрымаюцца многімі на паўднёвым усходзе, толькі пагаршае становішча і сапраўды можа прывесці да росту сепаратысцкіх настрояў. Кантраляваць пры дапамозе арміі трэць краіны было б вельмі цяжка і дзяржаве, якая знаходзіцца ў нармальнай фінансавай сітуацыі.

**Падобна на тое, што найноўшая гісторыя Украіны фарміруецца на аснове ўсё новых і новых памылак, якія прыводзяць кожны раз да вялікай колькасці загінулых і параненых.**

Па-другое, неабходна ўлічваць і асаблівасці дамінуючых прафесій на паўднёвым усходзе. Там вельмі шмат металургічных прадпрыемстваў і шахт. Работнікі металургічных заводаў і шахцёры пастаянна працуюць у складаных, небяспечных для жыцця ўмовах, і да іх у любой краіне неабходна ставіцца вельмі далікатна.

Гэта не гарадскі «офісны планктон», а рашучыя людзі, якія не баяцца рызыкаваць, звыклыя да каманднай працы і здольныя хутка аб'ядноўвацца і паслядоўна адстойваць свае інтарэсы. У сілу гэтага ў ваенны час яны становяцца ідэальнымі салдатамі і асабліва цэняцца на прызыўных пунктах. Злаваць іх у мірны час у іх уласных гарадах і пасёлках з дапамогай вайсковых аперацый не варта любому ўраду ў любой краіне.

Па-трэцяе, пастаяннае негатыўнае згадванне ў праграмах навін і ток-шоу Кіева жыхароў паўднёвага ўсходу як сепаратыстаў, у дачыненні да якіх неабходна прымаць самыя жорсткія захады, пастаяннае супрацьпастаўленне іх патрыятычна настроеным грамадзянам краіны ў іншых абласцях, здольна на самой справе сфарміраваць у іх падобныя настроі. І людзі, якія ўсяго толькі хацелі паважлівага стаўлення да сваіх інтарэсаў з боку цэнтральнай улады, пачнуць сур'ёзна задумвацца аб тым, каб аддзяліцца ад краіны, у якой іх не толькі не захацелі выслухаць, але і кінулі супраць іх ваенную тэхніку.

Якія рэцэпты выратавання ўкраінскай дзяржаўнасці? Яны досыць простыя. Замест ваяўнічай і абвінаваўчай рыторыкі ў СМІ і выкарыстання войска ва ўласных гарадах, неабходна перайсці да перамоў з жыхарамі паўднёвага ўсходу.

Наўрад ці так ужо цяжка ва ўмовах пастаянных змен канстытуцыі ва ўкраінскай рэчаіснасці сканструяваць такі яе варыянт, які дазволіць жыхарам з рознымі этнічнымі каранямі адчуваць сябе ў бяспецы ў сваіх гарадах і сёлах, не баючыся нападак з боку жыхароў іншых абласцей. І чым хутчэй адбудзецца пераход да рэалізацыі такога сцэнара, тым больш шанцаў ва Украіны захаваць сваю тэрытарыяльную цэласнасць.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### САЛЮТ, ХАКЕЙ І ПЕРАМОГА...

**Паралельна са святкаваннем 9 Мая ў Мінску сёлета будуць праходзіць і мерапрыемствы, прысвечаныя адкрыццю чэмпіянату свету па хакеі.**

— Традыцыйнае шэсце ветэранаў па праспекце Незалежнасці і ўскладанне вянкоў на плошчы Перамогі пройдзе 9 Мая з 10 да 11 гадзін. Адзінае адрозненне ад мінулых гадоў — невялікае скарачэнне маршруту. Шэсце сёлета пачнецца ад скрыжавання праспекта Незалежнасці і вуліцы Янкі Купалы, — паведаміў **начальнік упраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір Макараў.**

У сувязі з падрыхтоўкай да гэтага мерапрыемства 2 і 3 мая ў горадзе адбыліся трэніроўкі роты ганаровай варты.

Што датычыць канцэртных праграм, то, як звычайна, у кожным раёне сталіцы жыхароў запрашаюць да святочных пляцовак. Сёлета да звычайнага пераліку канцэртаў і забаў дададуцца мерапрыемствы ля «Мінск-Арэны», «Чыжоўка-Арэны» і Палаца спорту, якія будуць прысвечаны адкрыццю чэмпіянату свету па хакеі.

8 мая ў Палацы Рэспублікі пройдзе канцэрт майстроў мастацтваў. Сёлета арганізатары вырашылі зрабіць праграму на аснове песень Леаніда Уцёсава і Марка Бернэса. Выконвацца кампазіцыі будуць пад акампанемент аркестра народных інструментаў імя Л. Іванова Магілёўскай абласной філармоніі. Таксама гледачоў парадуюць выступленні салістаў Вялікага тэатра оперы і балета, артыстаў філармоніі, беларускай эстрады, тэатра і кіно. Па тэлебачанні канцэрт пакажуць удзень 9 мая.

Святочны салют паглядзець можна будзе 9 мая ў 22 гадзіны. Доўжыцца ён будзе 10 хвілін, а залпы чакаюцца з некалькіх месцаў. Гэта парк 50-годдзя Перамогі, пустка бліз вуліцы Прыгараднай, тэрыторыя аэрапорта «Мінск-1», раён Чыжоўскіх могілак і паўночна-ўсходні бераг вадасховішча «Дразды».

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

### ПАРАД АЎТО

**У Лепельскім раёне 7 мая адбудзецца аўтапрабег, прысвечаны 70-й гадавіне вызвалення Беларусі, у якім возьмуць удзел каля 400 школьнікаў і навучэнцаў.**

«Парад аўто» ўжо стаў традыцыйным. Калона стартуе ў райцэнтры, потым заедзе ва Ушачы, а фінішуе на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Прарыў» (Ушацкі раён).

Паводле слоў **І. Урбана, начальніка аддзела ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі райвыканкама,** у рамках мерапрыемства адбудуцца ўрачыстыя мітынгі, у тым ліку і з цырымоніяй прыёму ў рады піянерскай арганізацыі, уручэннем моладзі пуцёвак у трэці — працоўны — семестр. Падчас мерапрыемства будуць іграць ваенны і дзіцячы духавы аркестры, правядуць дэгустацыю страў паходнай кухні і г.д.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЖЫЛЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА: ЛІДЗІРУЕ МІНСК

**У першым квартале ў нашай краіне арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці пабудавана 15,6 тысячы новых кватэр (1,25 млн квадратных метраў агульнай плошчы жылля), што складае 25% да прадугледжанага задання на год, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Эксперты Белстата падлічылі, што пераважнымі крыніцамі фінансавання жыллёвага будаўніцтва з'яўляюцца ўласныя сродкі насельніцтва (51,4% гэтых інвестыцый) і крэдыты банкаў (27,3%). Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 622,4 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы, або 49,8% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. У параўнанні з І кварталам мінулага года ўвод у эксплуатацыю жылля для гэтай катэгорыі грамадзян зменшыўся на 50,2 тыс. квадратных метраў. З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для чаргавікоў пабудавана: з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі — 478,4 тысячы квадратных метраў у тым ліку, у шматкватэрных жылых дамах у гарадах — 421,9 тысячы «квадратаў».

Трэба адзначыць той факт, што па жыллёвым будаўніцтве сёлета ўпэўнена лідзіруе сталіца, дзе ў першым квартале было ўзведзена амаль 340 тысяч квадратных метраў. Потым ідзе Мінская вобласць (256 тыс.), Брэсцкая (193,7 тыс.), Гомельская (158 тыс.), Гродзенская (139,2 тыс.), Магілёўская (91,5 тыс.) і Віцебская (70,7 тыс. кв.).

**Сяргей КУРКАЧ.**

### КУРОРТЫ КРАСНАДАРСКАГА КРАЮ СТАЛІ БЛІЖЭЙ

**Адбыўся першы рэгулярны авіярэйс па маршруце Мінск — Краснадар — Мінск. Палёты на гэтаму кірунку «Белавія» будзе праводзіць тройчы на тыдзень — па панядзелках, серадах і пятніцах на самалётах CRJ-100\200, Embraer-175, Boeing-737\500.**

Краснадар — гэта сёмы пункт прызначэння ў Расійскай Федэрацыі, куды авіякампанія «Белавія» ажыццяўляе рэгулярныя рэйсы. Пачынаючы іх, яна ў першую чаргу разлічвае на жыхароў Беларусі, якія жадаюць адпачыць на курортах Краснадарскага краю, а таксама на ўжо сфарміраваны бізнес-паток. Апроч прамых пасажыраў, у авіякампаніі разлічваюць, што рэйсам скарыстаюцца і тыя, хто падарожнічае транзітам з Краснадара далей па маршрутнай сетцы «Белавія» праз Нацыянальны аэрапорт «Мінск». Як паведамілі ў аддзеле маркетынгу авіякампаніі, ужо на першым рэйсе з Краснадара ляцела каля 30 працэнтаў такіх транзітных пасажыраў, якія прадоўжылі свае падарожжы з Мінска ва Усходнюю і Заходнюю Еўропу.

### ЗНІЖКА ДА ДАЧНАГА СЕЗОНА

**Штогод у перыяд сельскагаспадарчых работ з 1 мая па 30 верасня грамадзяне, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту (мужчыны 60 гадоў, жанчыны — 55), маюць права на зніжку ў 50 працэнтаў ад кошту праезду ў цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа.**

Гэта прадугледжана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29.04.2011 №176 «Аб дзяржаўнай падтрымцы пенсіянераў». Дакументам не прадугледжана прадастаўленне гэтай ільготы пры праездзе ў электрацягніках рэгіянальных ліній бізнес-класа (з нумараванымі месцамі). Таксама зніжка ў 50 працэнтаў не даецца пры праездзе ў цягніках гарадскіх ліній. У прэс-цэнтры Беларускай чыгункі нагадалі, што для набыцця праязных білетаў са зніжкай пасажырам неабходна прад'яўляць арыгіналы пенсійных пасведчанняў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»**

Размер дивидендов за 2013 год на одну акцию составляет 1808,9847781246 руб. Выплата дивидендов за 2013 год будет производиться до 27 июня 2014 года.
Порядок выплаты дивидендов:
- физическим лицам:
а) выплата по отдельным ведомостям, одновременно с перечислением на карт-счета;
б) почтовым переводом;
- юридическим лицам — путем перечисления на расчетный счет. УНН 300000398

■ Купляйце беларускае

# РЫБКА БЕЗ ХІМІІ, АЛЕ З РУЧНОЙ РАСФАСОЎКАЙ

## Мінскі рыбзавод рыхтуецца да прыватызацыі і чакае інвестара

**Найстарэйшае ў краіне сталічнае прадпрыемства «Белрыба» займаецца перапрацоўкай марской рыбы ўжо амаль 60 гадоў. Сёлета гэтая дзяржкампанія вырабляе не толькі традыцыйную вэнджаніну без дабавак, кансервы з карпа, але і навінкі да чэмпіянату свету па хакеі.**



### Перамагае «класіка». Пакуль...

Гордасцю завода з'яўляецца вяндлярны цэх, які прайшоў рэканструкцыю 10 гадоў таму. Рыбу тут вэндзяць класічным метадам — дымапаветранай сумессю. Альховае пілавінне тлее, а дым вентылятарамі падаецца ў камеру. Цяжкія смолы пры гэтым застаюцца ў комінах.

Салёную і падрыхтаваную рыбу загружаюць у печ на тэрмін ад 12 гадзін да двух сутак. Салаку — больш, кільку — менш. На прадпрыемстве не выкарыстоўваюць фарбавальнікаў ці іншай хіміі. «Напрыклад, працэс паспявання рыбы ў нас адбываецца за трое сутак. У тых вытворцаў, якія паскараюць яго штучна, паспяванне адбываецца за суткі, — тлумачыць **намеснік дырэктара па вытворчасці прадпрыемства «Белрыба» Таццяна ШЫНКАРОВА**. Не дадаюць складаную хімію і адбельвальнікаў і ў селядзец. Працэс паспявання ідзе ў воцатна-салевым растворы з дабаўленнем цукру і прыпраў. Такім чынам тут імкнуцца захоўваць высокія стандарты натуральнасці атрыманай прадукцыі. А гэта не заўсёды падабаецца гандлю, які патрабуе працяглыя тэрміны прыдатнасці і плюсавую тэмпературу захоўвання прадукцыі на прылаўках. Зразумела, што рыба без вялікай порцыі кансервантаў у такіх умовах працяглы час захоўвацца не будзе. Але сталічнае прадпрыемства не збіраецца адмаўляцца ад сваёй «натуральнасці», бо хто тады будзе клапаціцца пра здароўе спажыўцоў? Таму нашы спецыялісты пераконваюць кіраўніцтва ў тым, што трэба захаваць класіку і традыцыйныя метады апрацоўкі рыбы.

Аб'ёмы вытворчасці вэнджанай прадукцыі ў прадпрыемства вялікія. У месяц выпускаецца каля 200 тон вэнджанай і вяленай рыбы, а летам — да 400 тон. З буйной рыбы вэндзяць ісландскі палтус і філе марской рыбы, а таксама кету, гарбушу і вугра. На жаль, але вугра ў крамах сёння не знойдзеш, бо ён вельмі дарагі. Яго ў завода купляюць невялікімі партыямі толькі сур'ёзныя рэстараны. А вось сёмгу, якую раней вэндзілі, цяпер вырабляюць выключна слабасалёную — толькі такую цяпер і купляюць.

Застаецца сёння «Белрыба» лідарам па вяленні. Не ўсе вытворцы цяпер вяляць рыбку, бо гэта вельмі энергазатратная справа. Ажыццяўляецца яна ад пяці дзён і больш, таму прадукцыя атрымліваецца дарагая. «Але пакупнікі бяруць, і нават у апошні час аддаюць перавагу хутчэй вяленай, чым вэнджанай», — расказвае спадарыня Шынкарова.

**Нашы спецыялісты пераконваюць кіраўніцтва ў тым, што трэба захаваць класіку і традыцыйныя метады апрацоўкі рыбы.**

### Карп у бляшанцы

Кансервавы цэх нанова быў адкрыты ў межах дзяржаўнай праграмы па імпартазамяшчэнні адносна нядаўна — у 2012 годзе. Сёння тут робяць кансервы трох відаў: натуральныя, натуральныя з дабаўленнем алею і ў таматным соусе. «Упакаваны» сняданак тут бывае з селядца, сайры, гарбушы і іншых відаў рыбы. Дарэчы, «Белрыба» таксама вырабляе кансервы з рачной рыбы (з карпа, таўсталобіка і ляшча) з дабаўленнем алею і ў таматным соусе. Прадукт атрымліваецца амаль «хатнім», таму што вырабляецца ён з астуджанай свежай рыбы з мясцовай «рэгістрацыяй». За 8 гадзін змены кансервавы цэх выпускае 20 тысяч бляшанак. Працэс гэты стандартны: рыба раскладваецца па бляшанках, якія стэрылізуюцца ў аўтаклаве; потым праходзіць этап маркіроўкі акцызнымі маркамі.

Кансерва з карпа мае свайго пастаяннага пакупніка, бо такая прадукцыя нагадвае «сямейную кухню», толькі без костак. Аднак канкурыраваць з кансервамі з марскіх дзяржаў беларусам складана. На плечы перапрацоўшчыкаў кладуцца і выдаткі на транспарціроўку, захоўванне. А ў выніку беларускія кансервы атрымліваюцца даражэйшымі па сабекошце. Але прадаваць трэба нават тады, калі вытворчасць лічыцца нерэнтабельнай. А цяпер і цэх загружаны не на поўную магутнасць. Кансервавы цэх будаваўся з улікам таго, што ў дзяржавы было выключнае права на імпарт рыбы, расказвае галоўны эканаміст завода Святлана Казлова. Ды і сёлета выключнае права па пастаўцы кансерваў на рынак захавана, аднак пашырана кола імпарцёраў гэтага віду прадукцыі. Гарадскому камбінату «змагацца» з прыватнымі структурамі суседняга гіганта стала цяжкавата.



Але адназначна казаць, што кансервавы цэх трэба закрываць, нельга, упэўнены спецыялісты. Мясцовыя кансервы няхай і даражэйшыя чым у «замежнікаў» недзе на 30%, але іх купляюць. На прадпрыемстве разлічваюць на адукаванага пакупніка, які ацэніць натуральнасць і якасць айчыннага вытворцы.

### Цяпло жаночых рук

Вэнджаную рыбу работнікі раскладваюць уручную. Кільку кладуць прыгожымі радамі. Раней спрабавалі механізаваць працэс упакоўкі, калі ў 2008 годзе купілі спецыяльную машыну па ўкладцы. Але пакупнік не прыняў тавар, бо машына ломіць кільку. Марскую капусту таксама ўзважваюць уручную. Гэта крыху здзіўляе, калі кожны латок работнік ставіць на шалі і шчыпком трохі дадае ў слоічак. Кавалкі сёмгі ці палтуса па 240 ці 300 грамаў работнікі адразаюць, не карыстаючыся ніякімі вагамі: шматгадовая праца не дае памыліцца. Уручную раскладваюць у кантэйнеры і селядзец, узважваюць кожную порцыю, дабаўляюць перац, прыправы і толькі потым адпраўляюць на механічную ўпакоўку. Тут за кожнай аперацыяй замацаваны асобны работнік у стэрыльных пальчатках. Праца гэта не зусім творчая, а, хутчэй, манатонная. Выконваюць яе выключна жанчыны. Так, 80% работ на прадпрыемстве ажыццяўляецца ўручную, але спецыялісты запэўнілі журналістаў, што такім жа чынам арганізавана праца на ўсіх сусветных рыбных прадпрыемствах.

**Канкурыраваць з кансервамі з марскіх дзяржаў беларусам складана. На плечы перапрацоўшчыкаў кладуцца і выдаткі на транспарціроўку, захоўванне.**

### Навінкі да чэмпіянату

Самым выгадным для «Белрыбы» аказалася вытворчасць прэсерваў. Гэта селядзец кавалачкамі і марская капуста, а таксама салаты з яе — усяго больш за 70 найменняў. Такі ўчастак цяпер працуе ў адну змену і выдае каля 100 тон прадукцыі ў месяц. Сухую капусту на прадпрыемства пастаўляюць з Кітая.

Асартымент селядцоў ва ўпакоўках на прадпрыемстве плануюць пашыраць. Да чэмпіянату свету па хакеі на прадпрыемстве выпусцілі філе селядца пад гандлёвай маркай «Белрыба» па новай рэцэптуры. **Памочнік гендырэктара прадпрыемства Вольга МУРАШКА** паведамляе, што падрыхтавана пяць новых пазіцый гэтай прадукцыі. Пад брэндам «Белрыба» на прадпрыемстве плануюць выпускаць і далікатэсную прадукцыю.



### Плюс «кропля» экспарту

Прадукцыя «Белрыбы» экспартуецца ў Малдову, Арменію і Канаду. У Расію накіроўваецца зусім мала перапрацаванай рыбы: аб'ёмы экспарту невялікія, бо расійскі рынак селядцом не здзівіш. Арменія і Туркменістан добра бяруць сёмгу, салёны селядзец у вёдрах па 8 кілаграмаў, капусту марскую лінейкі «Фітнес-ланч» з курагой і чарнаслівам. Па сутнасці, для краіны гэта кропля, але прагнозныя паказчыкі па экспарце завод выконвае.

### Пошук інвестара

На сайце Нацыянальнага агенцтва інвестыцый і прыватызацыі з'явілася інфармацыя аб тым, што прадпрыемства «Белрыба» выстаўлена на продаж. Аднак справа гэтая не зусім простая і хуткая. Спачатку трэба вызначыць кошт пасіваў і актываў прадпрыемства і яго далейшую перспектыву. Сёння яно стратнае.

Завод удзельнічае ў разнастайных тэндарах. Выйграе іх і пастаўляе прадукцыю па ўсіх бюджэтных арганізацыях. У дзіцячыя сады і школы накіроўваецца марская капуста, выробленая па спецыяльных рэцэптурах, рыба сталовых парод — мінтай і аргенціна. Кіраўніцтва завода тлумачыць сітуацыю тым, што змяніўся парадак увозу рыбапрадукцыі ў краіну. Калі раней канкурэнцыя была абмежаванай, бо рашэннем міжведамаснай камісіі былі вызначаны імпарцёры, якія мелі права ўвозіць на тэрыторыю Беларусі пэўныя віды прадукцыі, то цяпер рынак стаў вальнейшы. У Беларусь у вялікім аб'ёме ідзе перапрацаваная рыба з Расіі... «Белрыба» спрабуе змагацца і быць канкурэнтаздольнай, але кошт з'яўляецца вызначальным фактарам для спажыўцоў. Вяленая і вэнджаная рыба з Астраханскай вобласці, дзе іх вытворчасць адбываецца ў натуральных умовах, амаль напалову таннейшая. Цяпер на прадпрыемстве існуюць пэўныя фінансавыя складанасці, але ўжо летась вызначылася тэндэнцыя скарачэння страт у 2 разы. Сёння павялічваюцца аб'ёмы вытворчасці, аптовага і рознічнага тавараабароту. «Белрыба» актыўна праводзіць аптымізацыю асартыменту. Штомесяц тут «выкрэсліваюць» тыя віды прадукцыі, якія прадаюцца малымі аб'ёмамі, каб існавалі магутнасці для павелічэння вытворчасці запатрабаванай прадукцыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**ДАВЕДКА**

*Адкуль на беларускім прадпрыемстве рыба? Толькі каля 2-3% сыравіны на заводзе трапляе сюды не з-за мяжы. Гэта ў асноўным карп і таўсталобік, якія гадуюцца ў нашых рыбгасах. Марская рыба ж на прадпрыемства паступае з усіх сусветных басейнаў. Кілька і салака — з Балтыкі (Літвы, Латвіі, Калінінградскай вобласці). Мойва — з мурманскіх партоў, з краін Скандынавіі. Пастаўляе нам сыравіну і Паўднёвая Амерыка, далёкаўсходні і паўночны басейны Расіі.*

■ З рэдакцыйнай пошты

# ЁСЦЬ АЎТО — ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ

## Можа быць, варта павысіць кошт паліва і адмяніць пошліну?

**Абмеркаванне дзяржпошліны на транспарт, якая спаганяецца з аўтаўладальнікаў з пачатку гэтага года, здаецца, даўно сціхла. Але калі-нікалі да гэтай тэмы вяртаюцца зноў. Ці патрэбна? Ці правільна? Ці будзе вынік? Вось і ў нашу рэдакцыю прыйшоў ліст ад чытача, дзе ён піша аб несправядлівасці ўсеагульнасці гэтай пошліны. «Звязда» зразумела пазіцыю чытача і звярнулася па каментар да заканадаўцаў.**

**ФАКТ**

***Дзяржпошліна з уладальнікаў транспартных сродкаў за допуск аўтамабіля да ўдзелу ў дарожным руху спаганяецца з 1 студзеня 2014 года пры праходжанні тэхагляду.***

### Навошта плаціць за «прастой»?

«Я з'яўляюся аўтаўладальнікам ажно з 1965 года, калі набыў патрыманы аўтамабіль ГАЗ М20 «Перамога», — піша Аляксандр Яўгенавіч Хітро, пенсіянер, ветэран працы з Мазыра. — Потым, у 1975-м, перaабсталяваў яго на ГАЗ М21 «Волга», якая знаходзіцца ў мяне і сёння. Калі раней я амаль штодзённа карыстаўся сваім аўто і пры праходжанні чарговага тэхагляду плаціў за эксплуатацыю дарог (у 1970-80-я гады), то цяпер усё змянілася — за апошнія 10-15 гадоў я наязджаю ў год не больш як 100 км (ранняй вясной і позняй восенню на дачу і яшчэ на які-небудзь кірмаш). Такім чынам, я за год купляю не больш за 15 літраў паліва. А ёсць аўтаўладальнікі, якія наязджаюць у 100 разоў больш. Я асабіста да іх ніякіх прэтэнзій не маю (кожнаму сваё), але, згодна з законам, усе мы павінны плаціць аднолькава — і гэта ўжо нікуды не варта».

Вопытны аўтааматар звяртаецца да распрацоўшчыкаў закона: «Азірніцеся і зрабіце крок назад, дапрацуйце дакумент, унясіце дапаўненні, каб ён стаў больш-менш справядлівым для ўсіх катэгорый аўтаўладальнікаў. Я асабіста не супраць плаціць гэтую пошліну, і такі закон павінен быць, але больш дасканалы. Памеры гэтай пошліны павінны быць прывязаны не толькі да агульнай масы аўто, але і да колькасці спажытага паліва, бо вылічыць прабег аўто па спідометры практычна немагчыма. Як гэта падлічыць, трэба думаць. Ёсць, зразумела, просты варыянт (і ён ужо выкарыстоўваўся) — каб пошліну ўключылі ў кошт паліва». Аляксандр Яўгенавіч лічыць, што калі закон будзе дапрацаваны, «то многія аўтааматары меней будуць катацца, таўчы гэты асфальт, смуродзіць наваколле, ствараць аварыйныя сітуацыі, і наогул — скарыстаюцца грамадскім транспартам, які ў нас добра працуе. А некаторыя, замест выкарыстання сваёй машыны ў 100-600 конскіх сіл, у спрыяльнае надвор'е на невялікай адлегласці паедуць на 2-колавай машыне ўсяго ў адну чалавечую сілу».

А таксама аўтаўладальнік просіць заканатворцаў у выпадку, «калі вышэй сказаныя прапановы не пройдуць, дык вы хоць вызваліце ад гэтай пошліны 75-гадовых уладальнікаў аднаго старэнькага аўто».

### Не ўсё так проста

«Мая пазіцыя такая: калі людзі гавораць, што мы можам уключаць пошліну ў кошт паліва, то яны не ўлічваюць, што большая частка гэтага паліва спажываецца ў грамадскім сектары, — адказвае **Валерый БАРАДЗЕНЯ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.** — І гэта наўпрост паўплывае на выдаткі прадпрыемстваў. А значыць, на сабекошт прадукцыі ці паслуг. Не ўсё так лёгка, як здаецца». Заканатворца прывёў у доказ лічбы: спажыванне бензіну насельніцтвам займае прыкладна 60%, грамадскім сектарам — 40%; дызельнага паліва насельніцтва выкарыстоўвае каля 35%, астатнія 65% — грамадскі сектар. «Усё, што спажываецца грамадскім сектарам, рана ці позна трапляе ў цану прадукцыі. Гэта да слова аб сацыяльнай справядлівасці прапанаваных рашэнняў».

Нагадаем, што міністр фінансаў Андрэй Харкавец пасля прыняцця закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці і падаткаабкладання» казаў, што ўкладваць пошліну ў цану паліва было б памылкай: «Цэны на паліва ў нас ніжэйшыя, чым у іншых краінах. Калі б мы ўклалі гэтую пошліну ў цану на паліва, то перавысілі б кошт адзінкі паліва ў Расіі, Украіне, тут пайшлі б іншыя эканамічныя пытанні. Мы б прыйшлі да таго, што прымежжа запраўлялася б у Расіі, транзіт праходзіў бы праз краіну, не запраўляючыся. Эканамічныя страты былі б значна больш яўныя».

Згаджаецца з такой пазіцыяй і дэпутат: «Але тут трэба ўлічваць тое, што ў нас ёсць графік павышэння акцызаў на паліва з Расіяй. Таму мы і так зраўняемся з ёю — навошта спяшацца? Людзі яшчэ не ўлічваюць іншы аспект, што за апошнія гады ў нас адбылося выбуховае павелічэнне колькасці транспарту. Таму мы павінны прыдумляць новыя рычагі спагнання грошай. Справядліва ці не — гэта ўмоўнае паняцце. Сёння чалавек не ездзіць, а заўтра пачаў. Таму адназначна і лёгка адказаць на пытанне немагчыма. Мы лічым такі варыянт сёння найбольш прымальным. Не можа быць аргументам тое, што ў чалавека старая машына. Калгасы таксама тады скажуць нам: «У нас старыя машыны, і пошліну плаціць не будзем». Магчыма, механізм недасканалы і мы будзем яго дапрацоўваць, але ў любым выпадку мы павінны ўсе разумець, што пры такім росце колькасці аўто мы будзем шукаць новыя магчымасці фінансавання дарожнага будаўніцтва, інакш гэтыя дарогі ўсе разбурацца. Увогуле, любое падаражанне паліва — гэта інфляцыя. Ніякія пошліны так не страшны, як гэта інфляцыя. Мы павінны з ёю змагацца. Таму я супраць падаражання паліва. Гэта знізіць і нашу канкурэнтаздольнасць».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Бізнес-крок

# САКРЭТЫ ЦЭНАЎТВАРЭННЯ

## Не спяшайцеся прадаваць танней за ўсіх

**Адна з самых невідавочных рэчаў у бізнесе — тое, што нізкая цана не з'яўляецца найлепшай прапановай. Напэўна, вы ведаеце аб такой эканамічнай тэорыі — «пры росце цэн попыт падае», альбо, наадварот, «чым ніжэйшая цана, тым вышэйшы попыт»? У рэальнасці ўсё не заўсёды так. Для таго, каб гэта зразумець, мы прааналізуем жаданні вашых кліентаў і іх патрэбы.**

### Нельга апускацца «ніжэй за плінтус»

Ёсць тып кліентаў, для якіх важна, каб была самая нізкая цана. Прычына, па якой яны прымаюць рашэнне аб куплі, — гэта самы выгадны для іх кошт. Калі вы сапраўды з'яўляецеся пастаўшчыком з самымі нізкімі цэнамі, то за такіх кліентаў можна змагацца.

У многіх бізнесменаў, якія выбіраюць шлях па прапанове самых танных тавараў і паслуг, існуе даволі сур'ёзная праблема: канкурэнты таксама, услед за вамі, зніжаюць цэны. Да ўсяго гэтага неабходны зніжэнні выдаткаў і маржы. Колькі пастаўшчыкоў прапануюць мінімальную цану? Магчыма, адзін. Але не факт, што ім будзеце менавіта вы. У выніку падобныя маніпуляцыі аказваюцца абсалютна бескарыснымі. На шчасце, такіх кліентаў не вельмі шмат.

### Акцыі лепш, чым нізкая цана

Другі тып — гэта прафесійныя кліенты. Іх мэтай з'яўляецца атрыманне максімуму ад здзелкі з мінімальным укладаннем грошай. Яны вельмі няздрэнна разбіраюцца ў прадукце і аптымізуюць грошы, а не вынік. Калі параўнаць згаданыя тыпы, то для першых галоўнае цана, а другіх цікавіць максімальны вынік за свае грошы. Акцыі, падарункі і бонусы для прафесійных пакупнікоў працуюць асабліва добра. Да таго ж падарункі і бонусы, якія не маюць нічога агульнага з вашым прадуктам, працуюць нашмат лепш. У b2b ( business-to-business) сегменце гэтых пакупнікоў большасць.

### Галоўнае — не перашкаджаць

І трэці тып кліентаў — гэта людзі, якія шукаюць вынік сёння. Яны маюць патрэбу ў вырашэнні праблемы, і чым хутчэй яна будзе вырашана, тым лепш. Час дастаўкі і гарантыя выніку для такіх пакупнікоў вельмі важная. Калі такі кліент прыйшоў да вас, значыць ён ужо прыняў рашэнне аб куплі менавіта ў вас. Тут галоўнае — дапамагчы падабраць прадукт і не перашкаджаць. Магчыма, гэта самы найлепшы тып кліентаў, таму што рашэнне ўжо прынята. На жаль, такіх пакупнікоў меншасць.

### Чым даражэй, тым якасней?

Варта таксама ведаць: псіхалогія людзей уладкавана такім чынам, што адзін і той жа тавар або паслуга, якія прапанаваны за высокую цану, часта ўспрымаюцца як самыя якасныя. Нярэдка попыт на ваш прадукт акажацца вышэй пры значным павелічэнні цэн. Для таго, каб падабраць найбольш аптымальную цану для кліентаў, неабходна вызначаць кошт і глядзець, як павялічацца або зменшацца продажы. Такое тэсціраванне адбываецца наступным чынам: у адзін цудоўны дзень вы змяняеце цэннікі ў краме і назіраеце, як змяніліся продажы. Калі яны ўпалі, то адкідаем гэты варыянт. У пэўны момант вы знойдзеце аптымальны варыянт цаны.

**Андрэй МЯСНІКОЎ,**
**бізнес-кансультант, бізнес-трэнер.**

**P.S.** *Калі ў вас ёсць нейкія канкрэтныя пытанні, звязаныя са сваёй справай, дасылайце іх, калі ласка, на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці задавайце па тэлефоне 8 017 292 38 02.*

# ІДЭЯ БАНК: ЯШЧЭ БОЛЬШ КРЭДЫТАЎ ДЛЯ МАЛОГА І СЯРЭДНЯГА БІЗНЕСУ

**Ідэя Банк падрыхтаваў новыя прапановы для малога і сярэдняга бізнесу, для тых, хто збіраецца будаваць з нуля або развіць і пашырыць сваю справу — ад кансультацыі да выдачы крэдыту. Такі кірунак будзе развівацца пад новым брэндам «Idea Bank Business». Спецыяльныя аддзяленні — камфортныя для абмеркавання і прыняцця ўзважанага рашэння — ужо дзейнічаюць у сталіцы і абласных гарадах.**

— Наш банк мае магчымасць прадаставіць крэдыты ў валюце за кошт сродкаў, прыцягнутых ад міжнародных фінансавых крэдытных арганізацый, — тлумачыць **старшыня Праўлення ЗАТ «Ідэя Банк» Таццяна МЯДЗВЕДЗЕВА.** — Мы ацэньваем патэнцыял бізнес-праекта і прымаем рашэнне на працягу некалькіх дзён. Узровень ставак залежыць ад фінансавых магчымасцяў кліента. Хуткасць выдачы крэдыту юрыдычным асобам можа заняць каля тыдня...

За 10 гадоў работы на беларускім рынку ЗАТ «Ідэя Банк» трапіў у пяцёрку буйных па колькасці аддзяленняў — 198 аддзяленняў працуюць у 97 гарадах краіны, стаў лідарам па прадастаўленні рознічных паслуг фізічным асобам — укараніў эксклюзіўныя прадукты і паслугі, а па выніках 2012 года наогул заняў першае месца ў рэйтынгу айчынных банкаў.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**


## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ОАО «МИНСКТЕЛЕКОМСТРОЙ» ЗА 2013 ГОД

**Месторасположение**: 220037, г. Минск, ул. Аннаева, 49/1-1, тел. (8-017) 245-83-12
**Количество акционеров**: всего – 412, в том числе юр. лиц – 1, физ. лиц. – 411.
**Основной вид деятельности** – строительство инженерных сооружений связи.
**Среднесписочная численность работающих** – 296 человек. **УНП** 100068131

### Информация о дивидендах и акциях

| Наименование показателя | Ед. изм. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 1886.6 | 1455.7 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 13 192 | 10179 |
| Обеспеченность акций имуществом общества | тыс. руб. | 336.0 | 240.6 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | шт. | - | - |

### Информация о задолженности

| Наименование показателя | Ед. изм. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | 3 952 | 56 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | - | - |

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2014 года

(в миллионах белорусских рублей)

| АКТИВ | Код строки | На конец отчетного периода | На начало года |
|---|---|---|---|
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | **190** | **24 044** | **15 920** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 9 046 | 8 520 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 397 | 300 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 3 | 24 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 13 155 | 5519 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 7 929 | 9122 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 9 | 9 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **30 539** | **23494** |
| **БАЛАНС** | **300** | **54 583** | **39414** |
| ПАССИВ | Код строки | На конец отчетного периода | На начало года |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 14 301 | 372 |
| Резервный капитал | 440 | 639 | 514 |
| Добавочный капитал | 450 | 6 414 | 15921 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 26 703 | 17602 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **48 057** | **34409** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **590** | **0** | **103** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | **690** | **6 526** | **4 902** |
| **БАЛАНС** | **700** | **54 583** | **39414** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2013 года

(в миллионах белорусских рублей)

| Наименование показателей | Код строки | За январь–декабрь 2013 г. | За январь–декабрь 2012 г. |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 94 706 | 71 682 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 64 757 | 48 563 |
| Валовая прибыль (010 – 020) | 030 | 29 949 | 23119 |
| Управленческие расходы | 040 | 9 580 | 6169 |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 )** | **060** | **20 369** | **16950** |
| **Прочие доходы по текущей деятельности** | **070** | **2 080** | **643** |
| **Прочие расходы по текущей деятельности** | **080** | **7 506** | **5947** |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности (060+070-080)** | **090** | **14 943** | **11646** |
| **Доходы по инвестиционной деятельности** | **100** | **1 457** | **1336** |
| **Доходы по финансовой деятельности** | **120** | **58** | **24** |
| **Расходы по финансовой деятельности** | **130** | **59** | **181** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности** | **150** | **1 456** | **1179** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (090+150)** | **160** | **16 399** | **12825** |
| Налог на прибыль | 170 | 3 768 | 3104 |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (160-170)** | **210** | **12 631** | **9721** |

24.02.2014

Директор Л.И. Адамович

Главный бухгалтер Н.И. Бондарович

### АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ по бухгалтерской отчетности ОАО «Минсктелекомстрой» за 2013 год

**Адресат:**
Директору ОАО «Минсктелекомстрой» Адамовичу Леониду Ивановичу
**Аудируемое лицо:**
Открытое акционерное общество «Минсктелекомстрой», ул. Аннаева, 49/1-1, 220037, г. Минск. Свидетельство о государственной регистрации № 100068131, выдано Минским городским исполнительным комитетом 04.07.2000 г., УНП 100068131.
**Аудиторская организация:**
Аудиторское частное унитарное предприятие «АудитПАВ», ул. Якубова, 56/1-173, 220095, г. Минск. Свидетельство о государственной регистрации № 190361476, выдано Минским городским исполнительным комитетом 04.06.2002 г., УНП 190361476.
Бухгалтерская отчетность ОАО «Минсктелекомстрой», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Минсктелекомстрой» на 1 января 2014 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2013 г., при этом совершенные ОАО «Минсктелекомстрой» финансовые (хозяйственные) операции во всех существенных отношениях соответствуют законодательству.
24.02.2014

Директор УП «АудитПАВ» А.В. Позняков

Аудитор И.А. Романенко
Дата получения аудиторского заключения 24.02.2014



## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 06 июня 2014 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | **Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-3379 общей площадью 1030 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Немига, 30/1 (наименование: Здание клуба. Литер К 2/к; назначение: здание неустановленного назначения)** |
| **Продавец имущества** | МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч», ул. Короля, 2, АБК, каб. 415, 220004, г. Минск |
| **Организатор торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 29 926 770 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 2 900 000 000 белорусских рублей |
| **Условия торгов (условия продажи)** | 1. Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.<br>2. При приобретении права собственности на предмет торгов (продаваемое имущество) покупатель обязуется на протяжении одного месяца подписать охранное обязательство в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» |
| **Наличие обременений** | аренда |

Продаваемое имущество является историко-культурной ценностью.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **06 июня 2014 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 06.05.2014 по 04.06.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);**
**(017) 200-12-65, 226-59-70**
**(МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч»).**



Печать ООО «РосМирСтрой» (УНП 691313915) **считать недействительной.**

Ігуменскі тракт
№ 15 (73)

# ЛЫЖКА ЗА ХАЛЯВАЙ, А ВІДЭЛЕЦ — НА СТАЛЕ

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

**Відэлец — здавалася б, вельмі просты сталовы прыбор, тэхналагічна нават прасцейшы за лыжку. Але пакуль ён заняў сваё месца на стале, прайшло вельмі шмат часу — і гэта з-за забабонаў і стэрэатыпаў масавай свядомасці.**

Відэлец выкарыстоўвалі яшчэ старажытныя грэкі і рымляне, пра што сведчыць мноства археалагічных знаходак. Ён нават згадваецца ў Бібліі (кніга Самуэля, 2:13). Але напачатку ён не быў індывідуальнай прыладай для ежы, а выкарыстоўваўся на кухні для раскладвання папярэдне нарэзаных кавалкаў мяса па талерках. Найбольш распаўсюджаным відэлец быў на Блізкім Усходзе, у тым ліку у Візантыі, і менавіта там ім пачалі карыстацца паасобку. Доўгі час відэльцы мелі два доўгія і прамыя зубцы — даўжэйшыя за тронкі (часцей за ўсё, касцяныя). Заходняя Еўропа (не кажучы пра Усходнюю і Паўночную), дзе з надыходам сярэдніх вякоў адбыўся пэўны рэгрэс у тэхналогіях і побыце, такой раскошы ўсё ж не ведала.



Візантыйская прынцэса Марыя Аргіра, якая ў самым пачатку XI стагоддзя выйшла замуж за дожа Венецыі, прывезла з сабой відэльцы. «Пальцамі да ежы не датыкалася, а прымушала еўнухаў наразаць яе на маленькія кавалачкі. Яна падчапляла іх адмысловай залатой прыладай з двума зубцамі і клала ў рот», — апісваў усходняе дзіва святы Пётр Даміяні. Аднак спачатку відэльцы былі ўспрыняты вельмі негатыўна, асабліва каталіцкай царквой. Магчыма, таму, што нагадвалі вілы — сталы іканаграфічны атрыбут шатана. Нават заўчасную смерць прынцэсы тлумачылі карай Божай за грахоўны відэлец. Тым не менш менавіта Італія, чые кантакты з Візантыяй былі найбольш трывалымі, паступова стала першай заходнееўрапейскай краінай, у якой відэлец стаў звыклым прадметам побыту. Але амаль паўтысячагоддзя за межамі Апенінскага паўвострава ім практычна не карысталіся.

З Італіі відэлец трапіў і ў Рэч Паспалітую. Лічыцца, што прывезла яго да нас Бона Сфорца, жонка караля Жыгімонта Старога, разам са сваім італьянскім пасагам (1518 год). А ўжо ад каралеўскага двара моду паступова пераняла арыстакратыя. Лічыцца, што менавіта Польшча і Літва зрабіліся другім пасля Італіі цэнтрам відэльцавай моды. Нават у Францыю відэлец быццам бы трапіў з нашых краёў: кур'ёзны кароль польскі Генрых Валуа, які прасядзеў на троне ўсяго некалькі месяцаў, а потым уцёк дадому ў Парыж (1574 год), нічога не ўпадабаў у сваіх часовых «варварскіх» падданых, апроч відэльца. Калі ён стаў каралём дома, укараніў відэлец і там.

У Англію відэлец трапіў з Італіі толькі на пачатку XVII стагоддзя, і для яго замацавання ў побыце спатрэбілася не адно дзесяцігоддзе. Прыкладна адначасова відэлец стаў прывычнай прыладай і ў скандынаўскіх краінах. У гэты самы час упершыню ўбачылі яго і ў Расіі. Прывезла яго туды Марына Мнішак, жонка самазванца Ілжэдзмітрыя І. На вяселлі Марыны і самазванца відэлец надзвычайна шакіраваў рускае баярства і духавенства, як і іншыя заходнія «вычварэнствы». А вось палякі дагэтуль ганарацца тым, што адыгралі такую значную ролю ў распаўсюджванні відэльца па ўсёй Еўропе — ад Францыі да Расіі.

З «сармацкіх» часоў захавалася прыказка: «Лыжка за халявай, а відэлец — на стале». Справа ў тым, што лыжку дробная шляхта насіла з сабой за халявай ботаў, а відэльцаў не мела ўвогуле, і толькі на раскошных сталах магнатаў, за якія яе клікалі падчас сеймікаў, магла іх убачыць. І тое не заўжды: абавязковае забеспячэнне кожнага госця нажом і відэльцам пры каралеўскім двары звязваюць толькі з каралём Аўгустам ІІ (сярэдзіна XVIII стагоддзя).

У XVIII стагоддзі ў Францыі і Германіі ў відэльцаў з'явіліся 3 або нават 4 зубцы (як прынята і сёння), і іх сталі выгінаць дугой, каб відэльцам было прасцей зачэрпваць сыпкую ежу. Такая форма досыць хутка распаўсюдзілася і ў прывілеяваных класаў Рэчы Паспалітай. Для параўнання, у Англіі да пачатку XIX стагоддзя захоўваліся традыцыйныя відэльцы з двума доўгімі зубцамі. Ну, а для сялянскай большасці Беларусі відэлец заставаўся невядомым ледзь не да сярэдзіны XX стагоддзя, калі ён шырока распаўсюдзіўся дзякуючы войску і грамадскаму харчаванню.

■ Гісторыя асобы

# ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ БІЗНЕСМЕН

## Род Эдварда Вайніловіча ні перад кім шапкі не здымаў

**Гарадскі суддзя, прадпрымальнік, стацкі саветнік, дэпутат расійскай Дзяржаўнай Думы, старшыня Мінскага сельскагаспадарчага таварыства Эдвард Вайніловіч дасягнуў усяго сваімі намаганнямі. Ён з залатым медалём скончыў гімназію і паехаў у Германію збіраць лакаматывы, пацвердзіўшы тэзіс: «Тэорыя без практыкі мёртвая».**

У сваім завяшчанні Эдвард Вайніловіч напісаў: «Род наш ні перад кім шапкі не здымаў. Калі амаль уся шляхта Навагрудскага ваяводства збірала свае багацці з дробак радзівілаўскага стала і з заложнікаў выйшла ў гаспадары, мы ні адзінай пядзі зямлі ад іх не ўзялі. Ва ўсёй шырокай акрузе Савічы, мабыць, адзіны вольны маёнтак».

### ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА І ПАТРЫЯТЫЗМ

Тэхнолаг па адукацыі, дваццацісямігадовы Вайніловіч пасля смерці бацькі ў 1874 годзе ўступае ў валоданне родавымі маёнткамі Савічы і Пузава. З гэтага часу ён звязаў свой лёс з зямлёй, стаўшы адначасова актыўным удзельнікам грамадскага жыцця ў шматлікіх сферах. Яшчэ пры жыцці бацькі Эдвард удзельнічаў у кампрамісных судах, адначасова дапамагаў асірацелым сем'ям. Усе свае грамадскія абавязкі выконваў добрасумленна, ішоў на кампрамісы, калі гэта дапамагала вырашыць праблему, і хутка набыў давер людзей.

Ажаніўся Эдвард Вайніловіч у трыццаць пяць гадоў, забяспечыўшы да таго часу дабрабыт чатырох сясцёр і цвёрда стаўшы на ногі. Яго абранніцай стала любімая дзяўчына Алімпія Узлоўская. Аднак сямейнае жыццё стала цяжкім выпрабаваннем для мужа і жонкі.

Да пачатку XX стагоддзя Эдвард Вайніловіч стаў буйным прадпрымальнікам і валодаў шматлікімі землямі і фабрыкамі ў Мінскай губерні. Да таго часу на 90 тысяч мінчан быў усяго адзін каталіцкі храм. Ён разам са сваёй жонкай Алімпіяй падахвоціўся ўзвесці культавы будынак за ўласны кошт у памяць пра памерлага сына Сімона, які пражыў толькі дванаццаць гадоў. У 1903 годзе ў Мінскую гарадскую думу была накіравана заява прыхаджан Кафедральнага касцёла. Пад лістом, у якім даказвалася неабходнасць будаўніцтва новай святыні, было сабрана больш за 2 тысячы подпісаў.

**Кошт храма склаў больш за 300 тысяч рублёў, што раўнялася палове гадавога даходу горада Мінска.**

Пакуль расійскае чынавенства разбіралася з просьбамі вернікаў, Вайніловічаў напаткала яшчэ адна трагедыя. У гэтым жа годзе, не дажыўшы ўсяго адзін дзень да свайго дваццацігоддзя, памерла іх дачка Алена-Бянігна. Яе бацька запісаў у дзённіку: «З некалі моцнага дрэва майго роду ападалі лісток за лістком, і я застаўся як адзінокая галінка, асуджаны на смерць, нібы абпаленае громам дрэва, якое ўжо ніякая вясна не ажывіць».

Эдвард і Алімпія Вайніловічы вырашылі пабудаваць храм у гонар святых Сымона і Алены — як памяць пра сваіх дзяцей (Сына яны назвалі ў гонар апостала Сымона, а дачку — у гонар святой Алены, маці імператара Канстанціна, які зрабіў хрысціянства афіцыйнай рэлігіяй). Кошт храма склаў больш за 300 тысяч рублёў, што раўнялася палове гадавога даходу горада Мінска.

### ДЗЯРЖАЎНАЯ СЛУЖБА І АГРАРНАЕ ТАВАРЫСТВА

З увядзеннем у Расіі канстытуцыйнага ладу, пасля падзей 1905 года, перад мінскім прадпрымальнікам адкрыліся новыя перспектывы. Эдвард Вайніловіч абіраецца прадстаўніком Заходніх губерняў у Дзяржаўнай Думе Расійскай імперыі. У Дзяржсавеце ён займае высокае становішча члена фінансавай камісіі, асабліва важнай у сувязі з вылучэннем на першы план І Дзяржаўнай Думай аграрнага пытання.

У 1876 годзе Вайніловіч быў абраны членам Мінскага зямельнага таварыства (аграрнага таварыства). Дзякуючы яго ўзмоцненай і працяглай працы, Мінскае таварыства, якое павінна было служыць мэтам русіфікацыі, служыла мясцоваму насельніцтву, аб'ядноўваючы ў сваім складзе некалькі сотняў землеўладальнікаў з аднятых губерняў. Месцы ў дзяржаўным апараце расійскія чыноўнікі сталі ўступаць беларускім земляробам з загарэлым тварам.

Доўгі час Мінскае таварыства было лепшым сярод сельскагаспадарчых таварыстваў Расійскай дзяржавы. У 1905 годзе яно аб'ядноўвала ўсе найбольш моцныя асабістыя гаспадаркі ў літоўскабеларускіх губернях.

Сельскагаспадарчая выстава, адкрытая ў 1901 годзе ў сувязі з 25-годдзем зямельнага таварыства, была ўвасабленнем ідэй, трыумфам дзейнасці Вайніловіча, які змог парадавацца вынікамі сваёй працы. Выстава была аглядам сіл і дасягненняў беларускіх і літоўскіх гаспадарак. Шматлікія госці захапляліся жыццяздольнасцю і ўсёй структурай сельскай гаспадаркі ў маёнтках Вайніловіча.

### РЭВАЛЮЦЫЯ І ВАЙНА

Кастрычніцкая рэвалюцыя, сусветная, грамадзянская, польскасавецкая войны спынілі гаспадарчую дзейнасць прадпрыемстваў Эдварда Вайніловіча. Каб аднавіць страты падчас нямецкай акупацыі, Вайніловіч стварыў супольнасць мінскіх сялян. Узначаліўшы яго, ён прад'явіў ваенным уладам патрабаванне абараніць маёмасць вяскоўцаў, якая бессэнсоўна знішчалася рознага роду рэквізіцыямі. Аднак уласны маёнтак Вайніловіча, размешчаны на шляху з Баранавічаў у Бабруйск, пастаянна падвяргаўся разбурэнням.

У 1921 годзе быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор, які пазбавіў Вайніловіча сродкаў да існавання. Пакідаючы малую радзіму Пузава і Савічы, Эдвард Вайніловіч не пажадаў скарыстацца дапамогай сваякоў, да якіх лёс паставіўся больш шчасліва. Ён пераехаў у мястэчка Быдгашч, што ў Польшчы, дзе і памёр 16 чэрвеня 1928 года і быў пахаваны на мясцовых могілках.

**Іван ГАРГУН**



■ Асабістае

# ЁН ЗАЎСЁДЫ КУДЫСЬЦІ СПЯШАЎСЯ...

## Успаміны пра гісторыка Генадзя Каханоўскага

**Калі маладзечанцы захочуць паставіць помнік свайму выдатнаму земляку Генадзю Каханоўскаму (а я думаю, што гэта рана ці позна адбудзецца), скульптуру вядомага гісторыка, на маю думку, трэба рабіць у выглядзе высокага, крыху хударлявага мужчыны ў капелюшы, плашчы пад пояс і абавязкова — з партфелем у руках. Прычым мужчына павінен відавочна кудысьці спяшацца...**

Менавіта такім запомніўся мне Генадзь Аляксандравіч. А бачыла я яго ў сваім дзяцінстве і юнацтве часта — бадай, кожны дзень. Мы жылі недалёка адно ад аднаго — нашы дамы і сёння стаяць у Маладзечне на суседніх вуліцах амаль паралельна, а вуліцы звязвае кароткі правулак.

Штодня гэтым правулкам Генадзь Каханоўскі ішоў на працу ў краязнаўчы музей, а ўвечар вяртаўся дадому. Уранку ён хадзіў шпарка, як ходзяць людзі мэтанакіраваныя, заклапочаныя важнай справай, якім трэба за дзень шмат чаго зрабіць, шмат куды паспець, але пры гэтым заўсёды ветліва здароўкаўся з усімі, у тым ліку і са мной, тады яшчэ школьніцай. Вядома, у той час я сама першай крычала яму: «Добры дзень!» Увечар жа, пасля працы, ён пры сустрэчы ўжо мог і прыпыніцца, распытаць, як справы, як вучоба... Калі ж на двары былі мае бацькі, ён абавязкова падыходзіў да іх, каб перакінуцца некалькімі словамі пра надвор'е, пра ўраджай, пра гарадскія навіны, і яшчэ, каб расказаць нам навіны пра Мішу. Міша — гэта Міхась Ткачоў, археолаг, гісторык, а ў далейшым — вядомы грамадскі дзеяч, родны пляменнік маёй маці і даўнішні сябар Генадзя Каханоўскага. Менавіта гэтая акалічнасць — наша радство з Ткачовым, бадай, і зблізіла нас з Каханоўскім.

Шчыра кажучы, Міхась прыязджаў у Маладзечна не столькі да нас, колькі да Генадзя Аляксандравіча. Пасядзеўшы гадзіны дзветры за накрытым сталом у нашай хаце, ён звычайна ішоў да сябра і мог ужо не вярнуцца, а позна ўвечары адразу ад Каханоўскіх пайсці на вакзал, на электрычку. Мая маці нават крыўдзілася за гэта на пляменніка, раўнавала яго да Генадзя Каханоўскага.

А мне такое было зразумелым. Я звычайна прысутнічала пры расповедах аднаго пра другога, таму добра ведала пра розныя нюансы і праблемы ў іх прафесійнай дзейнасці: пра нязгоду ў навуковых поглядах Ткачова з Абэцэдарскім (з дзяцінства ведала гэта прозвішча!), пра неадназначнае стаўленне мясцовых улад да дзейнасці Каханоўскага, пра цяжкасці падрыхтоўкі, а потым і абароны навуковых прац, на той час — доктарскай Ткачова і кандыдацкай Каханоўскага, і пра тое, як яны дапамагалі адзін аднаму... Ткачоў быў вельмі адкрыты чалавек. Ён усё шчыра распавядаў маёй маці падчас сваіх прыездаў да нас, а я заўсёды з зацікаўленасцю слухала (дзіўнае савецкае выхаванне: у сям'і чуць адно, у школе гаварыць, што патрабуюць, і ніколі не сказаць на людзях лішняга). Каханоўскі быў больш стрыманым, я сказала б, нават закрытым чалавекам: як цяпер разумею, рэаліі савецкага асяроддзя прымушалі яго да гэтага...

Прызнацца, ужо сёння, з вышыні пражытых гадоў, магу сказаць, што ў жыцці я рэдка сустракала такое доўгае, моцнае, шчырае мужчынскае сяброўства, заснаванае не толькі на прафесійным аднадумстве, але і на добрай, бескарыслівай узаемнай падтрымцы ...

З Генадзем Аляксандравічам Каханоўскім я лепш пазнаёмілася і больш зблізілася пасля школы, калі, не паступіўшы на філфак, пайшла працаваць на завод «Спадарожнік» і амаль адразу пачала наведваць літаратурнае аб'яднанне «Купалінка» пры маладзечанскай раённай газеце, якая тады называлася «Святло камунізму» (сёння — «Маладзечанская газета»). Генадзь Аляксандравіч быў адным з кіраўнікоў гэтага аб'яднання, і, бадай, ці не ён і паклікаў мяне туды, бо па-суседску быў у курсе маіх спраў і захапленняў.



Партрэт работы Анатоля Крывенкі.

І менавіта Генадзь Аляксандравіч сказаў мне: «Калі ты хочаш быць пісьменніцай (у чым я шчыра прызналася яму гадоў у васямнаццаць. — **Аўт.**), то пісаць трэба толькі на роднай мове!» За што я вельмі ўдзячная яму. Бо гэта вельмі важна для творчага чалавека, каб на самым пачатку шляху знайшоўся хтосьці вельмі аўтарытэтны для пачаткоўца і даў параду, якая потым паўплывае на ўсё жыццё...

**Уранку ён хадзіў шпарка, як ходзяць людзі мэтанакіраваныя, заклапочаныя важнай справай, якім трэба за дзень шмат чаго зрабіць.**

Гаворачы пра Генадзя Каханоўскага, нельга не расказаць крыху падрабязней і пра літаратурнае аб'яднанне «Купалінка». Думаю, гэта зусім невыпадкова, што з яго выйшлі такія вядомыя сёння паэты і пісьменнікі, як Ала Клемянок, Кастусь Цыбульскі, Таццяна Сапач (ужо, на жаль, нябожчыца), Людка Сільнова, Стася Наркевіч (Настасся Лазебная), Міхась Казлоўскі, крыху маладзейшы за нас, які стаў шчырым прыхільнікам краязнаўчай дзейнасці Генадзя Каханоўскага, фактычна яго паслядоўнікам...

Пасяджэнні звычайна праводзіў Уладзімір Пятровіч Давыдаў, маладзечанскі паэт. Ён быў ужо на пенсіі і з ахвотай, добрасумленна займаўся аб'яднаннем: збіраў нас, арганізоўваў выступленні, рыхтаваў нашы творы да публікавання ў газеце... Генадзь Аляксандравіч жа быў заняты на працы: спачатку ў Маладзечанскім краязнаўчым аддзеле, а пазней — ужо ў Мінску, у Акадэміі навук БССР. Таму нярэдка ён прыходзіў крыху пазней, здароўкаўся, садзіўся на крэсла збоку і моўчкі, уважліва слухаў нашы заняткі. А гэта былі сапраўдныя ўрокі творчасці: мы па чарзе чыталі адзін ці два свае новыя творы, і Уладзімір Пятровіч разбіраў іх па радку — глядзеў рыфму, рытм... Тут жа штосьці падпраўляў або раіў падумаць, пашукаць іншы радок... І ўсе прысутныя неабыякава, але добразычліва (неўзабаве і іх вершы пачнуць разбіраць!) удзельнічалі ў гэтым працэсе. Генадзь Аляксандравіч звычайна маўчаў, аддаючы перавагу паэту Давыдаву, а потым забіраў нашы паперкі і доўга, уважліва ўчытваўся ў тэксты: яго заўвагі былі больш па змесце, па сэнсе твора...

Дарэчы, хачу зазначыць: за ўсе гады, што я наведвала літаб'яднанне, не памятаю паміж яго членамі аніякіх інтрыг, крыўдаў, сварак, аніякай зайздрасці да больш таленавітых і паспяховых паэтаў, да таго, што хтосьці надрукаваўся ў сталічным выданні... Наадварот, мы толькі радаваліся адно за аднаго. Такая была творчая, стваральная, спрыяльная атмасфера. Безумоўна, тон гэтаму задавалі нашы кіраўнікі — Генадзь Каханоўскі і Уладзімір Давыдаў, абодва інтэлегентныя, далікатныя, высокаадукаваныя мужчыны. Прычым што немалаважна было: адзін быў «чыста рускі» творца, другі — «чыста беларус»... Таму пры адборы ў друк ніколі не аддавалася перавага творам на той ці іншай мове — адбіраліся найбольш удалыя: па выніках пасяджэння ў раёнцы заўсёды выходзіла старонка з вершамі, кароткімі апавяданнямі, казкамі. І як гэта было вельмі важна для творцаў-пачаткоўцаў!.. Хацелася пісаць яшчэ і яшчэ... Я і сёння захоўваю, як дарагую рэліквію, усе тыя ўжо пажоўклыя газетныя старонкі з выпускамі маладзечанскага літаб'яднання «Купалінка»...

Яшчэ адной яскравай старонкай у маёй памяці захоўваюцца ўспаміны пра нашы сумесныя паездкі на электрычцы з Маладзечна ў Мінск і назад.

Аднойчы мы ехалі ў вагоне з Каханоўскім. Ён вяртаўся пасля сустрэчы з Уладзімірам Караткевічам, быў у яго дома... Генадзь Аляксандравіч быў вельмі ўзрушаны. Ён з захапленнем пераказваў размову з пісьменнікам, сказаў, што ўвечары дома запіша яе ў свой дзённік. Дадаў, што ўсе цікавыя сустрэчы занатоўвае, каб не згубілася ніводнае слова... Вось гэта сапраўдны гісторык!...

Ён вёз дзве кніжкі Караткевіча, падпісаныя пісьменнікам: адну — самому Генадзю Аляксандравічу, а другую — нейкай жанчыне з Маладзечна, па яе просьбе... «Калі хочаш, папрашу, каб і табе Караткевіч кніжку падпісаў! Хутка зноў буду ў яго», — раптам шчыра прапанаваў мне Каханоўскі. «Ой, не, не трэба... няёмка...» — разгубілася я. Як цяпер аб гэтым шкадую!..

Апошні раз я бачыла Каханоўскага на пахаванні свайго бацькі. Ён памёр у студзені 1993 года, праз два месяцы пасля смерці Міхася Ткачова. Развітацца з бацькам прыйшлі амаль усе суседзі з нашага вялікага завулка і нават з навакольных вуліц. Шчыра кажучы, нават у горы было прыемна, што бацьку так паважалі людзі. Не было толькі аднаго чалавека — Генадзя Каханоўскага. Я заўважыла гэта. Я не бачылася з ім даўно — ужо шмат гадоў жыла па-за межамі Беларусі. І, прызнацца, мне хацелася пабачыцца з Генадзем Аляксандравічам і нават крыху пагаварыць. А яго не было... І толькі калі труну ўжо выносілі з хаты, я нарэшце ўбачыла Каханоўскага. Ён стаяў па-за натоўпам на ўзвышэнні, на невялікай прытаптанай гурбе пяску, пакрытай снегам, і ўважліва, нават неяк пільна, напружана глядзеў па-над галовамі на нябожчыка ў адкрытай труне, якую паставілі на машыну. У руках Каханоўскі трымаў чорны скураны партфель — напэўна, спецыяльна прыехаў з Мінска, каб развітацца... Такім я яго і запомніла. Ніхто тады яшчэ не ведаў, што ў Каханоўскага тая самая хвароба, ад якой сышоў мой бацька і якая сёння так бязлітасна косіць людзей. Генадзь Аляксандравіч памёр роўна праз год...

...Я вельмі рада, што мне яшчэ ў дзяцінстве пашчасціла на сустрэчу з такімі цікавымі, разумнымі, прыстойнымі, высокаадукаванымі, інтэлігентнымі людзьмі, якімі былі Генадзь Каханоўскі і Міхась Ткачоў. Ад іх сыходзіў такі пазітыў!.. Яны заўсёды цікава і са шчырай любоўю гаварылі пра беларускую гісторыю, навуку, літаратуру, мову, што не маглі не запаліць у маёй юначай душы жывы інтарэс да ўсяго гэтага...

**Тамара МІЖЫГУРСКАЯ-БУНТА, галоўны рэдактар часопіса «Алеся».**

■ На свае вочы

# «СКАРБЫ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ» — ГАСЦЯМ ЧЭМПІЯНАТУ

**З 25 красавіка па 6 чэрвеня ў Нацыянальным гістарычным музеі праходзіць выстава мастацкіх галаграм «ГАЛАГРАФІЯ-2014». На ёй прадстаўлены лепшыя працы мастацкай галаграфіі, створаныя ў Беларусі.**

Выстава прымеркавана да чэмпіянату свету па хакеі і мае на мэце пазнаёміць замежных гасцей і мінчан з дасягненнямі краіны ў галіне галаграфіі. Па словах арганізатараў, лейтматывам экспазіцыі абраныя выявы праваслаўных святынь. Сярод іх — галаграмы «Крыж Ефрасінні Полацкай», «Дары вешчуноў», «Жыровіцкая ікона Божай Маці».

«Мы стварылі галаграмы, якія выкарыстоўваюцца не толькі як малюнкі, але маюць і пэўную энергетыку. Усе выявы святынь асвячоныя царквой», — паведаміў Леанід ТАНІН, акадэмік Міжнароднай інжэнернай акадэміі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Акрамя царкоўных святынь, можна пабачыць серыю галаграм «Скарбы зямлі беларускай», створаную разам з Нацыянальным гістарычным музеем. Як распавяла першы намеснік дырэктара музея Ніна КАЛЫМАГА, на выставу трапілі многія з экспанатаў, якія не выстаўляюцца ў асноўнай экспазіцыі (усяго ў музеі налічваецца каля 400 тысяч адзінак захоўвання). Сярод іх — каштоўнасці сусветнага значэння. Напрыклад, такія, як скарб, знойдзены ў 1988 годзе ў Мінску каля гарадскога вала. Ён складаецца з больш як 300 прадметаў і мае вагу ў 13 кілаграмаў серабром. Экспанат у савецкі час хацеў займець Дзяржаўны гістарычны музей у Маскве, аднак скарб удалося захаваць у Беларусі. На выставе можна ўбачыць і галаграфічную выяву «пояса Вітаўта»: каштоўнасці, якая датуецца першай трацінай XV стагоддзя. Паводле падання, пояс быў падараваны вялікаму князю Вітаўту крымскім ханам Хаджы-Гірэем. Выстаўлены галаграмы іншых экспанатаў музея: старажытных манет, упрыгажэнняў і прадметаў быту.

Арганізатары паабяцалі зніжкі на наведванне выставы для балельшчыкаў чэмпіянату свету па хакеі (іх можна будзе атрымаць пры наяўнасці білетаў на матчы). Таксама ў наведвальнікаў ёсць магчымасць набыць сувенірную галаграфічную прадукцыю.

Упершыню падобнае мерапрыемства праводзілася ў сталіцы ў 2011 годзе. Тады яго наведала больш за сто тысяч чалавек.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ**

■ Раім наведаць

# АРХІТЭКТУРА НА АГАРОДЖЫ



**Напярэдадні чэмпіянату свету па хакеі ў беларускай сталіцы адкрылася выстава фотаздымкаў беларускай спадчыны. Ёй можна любавацца прама пад адкрытым небам — палотны з павялічанымі фотаработамі размясцілі на агароджы парку Чалюскінцаў.**



Арганізатарамі выступілі арт-цэнтр Вольгі і Андрэя Смалякоў, Міністэрства культуры і Мінгарвыканкам. Іх прадстаўнікі мяркуюць, што дзякуючы такому праекту Мінск стане сапраўдным мастацкім цэнтрам еўрапейскага маштабу, што гэта створыць яшчэ адзін яркі вобраз нашай сталіцы.

Усе фотарэпрадукцыі ўзяты з альбома «Спадчына Беларусі», над стварэннем якога працавалі журналісты Алег Лукашэвіч і Аляксандр Аляксееў. У экспазіцыі прадстаўлена старадаўняя архітэктура краіны: Камянецкая вежа, Каложская царква, палац Румянцавых-Паскевічаў, Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр і іншае — усяго больш за 50 выяў адметных збудаванняў.

Сваю працу над збіраннем фотаздымкаў нашай спадчыны Лукашэвіч і Аляксееў распачалі ў 2003-м годзе. З таго часу, акрамя згаданага ўжо альбома па архітэктуры, выдадзена таксама «Спадчына Беларусі. Скарбы», прысвечаная шэдэўрам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сёння агульны тыраж ужо рэалізаваных кніг склаў 42 тысячы 500 асобнікаў, што з'яўляецца рэкордам для нацыянальнага кнігавыдання.

Адну з першых сваіх выстаў фотамастакі вазілі калісьці ў Рым і вярнуліся адтуль... з пустымі рукамі, бо італьянцы выкупілі ўсе палотны. Натхніўшыся выявамі прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, англічане захацелі арганізаваць выставу нашых артэфактаў у Брытанскім музеі. Такія альбомы ёсць у бібліятэках Папы Рымскага, Патрыярха Іерусалімскага, брытанскай каралевы, у асабістых зборах Мікіты Міхалкова і Анджэя Вайды, на Гаваях і ў Японіі.

Чым жа так прываблівае краіна, убачаная праз аб'ектывы Алега Лукашэвіча і Аляксандра Аляксеева?.. Той спадчынай, пра якую часта не ведаюць самі беларусы. Цэрквы XII стагоддзя, гатычныя касцёлы, барочныя палацы і нават гарады, пабудаваныя італьянцамі, — усё гэта ўпершыню сабрана пад адной вокладкай. Беларусь паказана не як ускраіна пэўнай цывілізацыі, але як сапраўдны культурны асяродак Еўропы, дзе Усход і Захад сустрэўшыся, утвараюць арганічнае спалучэнне.

Мастацкі ўзровень альбомаў «Спадчына Беларусі» адзначаны шэрагам узнагарод. Аўтарам праекта ў 2005 годзе ўручана прэмія Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне».

Убачыць адметную экспазіцыю ля парку Чалюскінцаў можна будзе не толькі падчас чэмпіянату свету па хакеі — выстава пад адкрытым небам будзе працаваць да лістапада.



**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

# ОАО «Нафтан»

## РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ

**(с повышением начальной цены)**

**бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:**

| Наименование конкурса (пометка на конверте) | Наименование | Инв. № | Год выпуска | Начальная цена с НДС, руб. РБ |
|---|---|---|---|---|
| 1. Реализация неликвидов. Полуприцепы | Полуприцеп МАЗ 9758-012, гос. № 9801ВА | 13150621 | 2002 | 26 100 000 |
| | Полуприцеп МАЗ 975800, гос. № А0779А-2 | 13151036 | 2004 | 38 400 000 |
| | Полуприцеп МАЗ 9758 012, гос. № А0782А-2 | 13151032 | 2004 | 30 600 000 |
| 2. Реализация неликвидов. Маз. | Автомобиль МАЗ 54323-032, гос. № АВ5421-2 | 13151245 | 1995 | 48 000 000 |
| 3. Реализация неликвидов. Культиватор | Культиватор к минитрактору КТ-00200 | 15208972 | 2002 | 500 000 |
| 4. Реализация неликвидов. Бензоколонка | Бензоколонка /8994,722/ COM PRIMA/ | 6255970 | 2001 | 84 000 000 |
| 5. Реализация неликвидов. Трактор Т-25 | Трактор Т-25, гос. № БЯ 9994 | 04150072 | 1994 | 42 000 000 |
| 6. Реализация неликвидов. Зил | Автомобиль ЗИЛ ММЗ554М, гос. № ВМ1182 | 13150251 | 1991 | 48 000 000 |

Состояние удовлетворительное.
Предложения принимаются по адресу:
**211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 5 июня 2014 года**
с пометками на конверте, указанными в таблице.
Извещения на проведение конкурса размещены на сайте **www.naftan.by.**
**Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.**

УНП 300042199


**Считать недействительными** бланки квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1СУ серии КС № 4327848; страхового свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности транспортных средств на территории РБ серии ВС № 8977940; страхового полиса по договору страхования, заключаемом с физических лицом, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем по страхованию иному, чем страхование жизни серии БК № 0025175 СООО «Белкоопстрах» филиал в г. Могилеве.

УНП 100706519

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 06.06.2014 в 10.00 по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.**

## Организатором аукциона является республиканское унитарное предприятие «Отель «Минск»,

**находящееся по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11.**

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

1. Помещение № 12 арендуемой площадью 21,4 кв.м, на первом подвальном этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 545 700 рублей; размер задатка – 54 550 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
2. Помещение № 14 арендуемой площадью 26,5 кв.м, на первом подвальном этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 675 750 рублей; размер задатка – 67 550 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
3. Помещение № 17 арендуемой площадью 19,7 кв.м, на первом подвальном этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 502 350 рублей; размер задатка – 50 200 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
4. Помещение № 18 арендуемой площадью 18,5 кв.м, на первом подвальном этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 471 750 рублей; размер задатка – 47 150 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
5. Помещение № 19 арендуемой площадью 20,7 кв.м, на первом подвальном этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 527 850 рублей; размер задатка – 52 750 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
6. Помещение № 46, арендуемой площадью 10,3 кв.м, на первом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 262 650 рублей; размер задатка – 26 250 рублей; целевое использование – размещение офиса, осуществление розничной торговли; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
7. Помещение № 19, арендуемой площадью 36,3 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 925 650 рублей; размер задатка – 92 550 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
8. Помещения №№ 23, 24, 25, арендуемой площадью 34,5 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 879 750 рублей; размер задатка – 87 950 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
9. Помещения №№ 26, 27, 28, арендуемой площадью 34,2 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 872 100 рублей; размер задатка – 87 200 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.
10. Помещения №№ 29, 30, 31, арендуемой площадью 34,4 кв.м, на одиннадцатом этаже в здании по ул. Кирова, 18 (литер А 12/бл), в г. Минске; с центральным отоплением, электроснабжением, телефонизацией; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 877 200 рублей; размер задатка – 87 700 рублей; целевое использование – размещение офиса; ставка арендной платы за 1 кв.м – 306 000 рублей.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 06.05.2014 по 04.06.2014 с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00, по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 04.06.2014, не рассматриваются.**

